Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!

савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: інакагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капітэрлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок капітэрлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя на 50 проц. дарожэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 212 (2400) Пятніца, 14-га верасьня 1928 г.

Аб 3-й Сэсіі ЦВК БССР VIII скліканьня.

ТРЭЦЯЯ СЭСІЯ ЦВК БССР VIII СКЛІКАНЬНЯ

склікаецца на 15-га верасьня

1928 г. у горадзе Менску ў памяшканьні клюбу імя Карла Маркса.

Парадак дню Сэсіі наступны:

1. Дзяржаўны бюджэт БССР на 1928-29 г. (Дакладчык ад СНК БССР тав. МІКУЛІЧ і садакладчык ад Бюджэт. Камісіі ЦВК БССР тав. КАЛНІН).
2. Даклад аб масавай працы саветаў. (Дакладчык т. ХАЦКЕВІЧ).
3. Даклад Народнага Камісарыяту Сацыяльнай Забясьпекі і садаклад Цэнтральнага Камітэту Сялянскіх Таварыстваў Узаемадапамогі. (Дакладчык тав. КАЛНІН, садакладчык тав. ЖАРЫН).
4. Даклад і зацьверджаньне пастановы аб сыстэме народнае асьветы. (Дакладчык тав. БАЛІЦКІ).
5. Зацьверджаньне Палажэньня аб мясцовых фінансах БССР. (Дакладчык тав. БУНІН).
6. Інфармацыя аб ходзе будаўніцтва Асінастрою. (Дакладчыкі т. т. КАРП і АЛЕЙНІКАЎ).
7. Зацьверджаньне законаў, прынятых паміж II і III Сэсіямі ЦВК БССР. (Дакладчык тав. ХАЦКЕВІЧ).
8. Выкананьне бюджэту 1926-27 г. (Дакладчык ад СНК БССР т. МАТУС і садакладчык ад Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР т. КАЛНІН).
9. Зацьверджаньне Крымінальнага Кодэксу БССР. (Дакладчыкі т. т. СТАШЭЎСКІ і ГОХМАН).
10. Даклад камісіі па выданьні твораў ЛЕНІНА на беларускай мове. (Дакладчык тав. ІГНАТОЎСКІ).

Сакратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Станоўчае і адмоўнае ў самакрытыцы.

Самакрытыка, як мэтад барацьбы з недахопамі ў нашым будаўніцтве, к сучаснаму моманту мае шмат станоўчых вынікаў. Яна ўскрыла шмат нарываў як на целе нашай партыі, так і ў савецкім апараце, асабліва ў яго гаспадарчай частцы. Яна дапамагла адхіліць ад працы цэлы шэраг нягодных кіраўнікоў. Яна абудзіла актыўнасьць і зацікаўленасьць з боку мас да сацыялістычнага будаўніцтва.

Але-ж нельга сказаць, каб усё гэта было зроблена ў поўнай меры, і што ў далейшым задача самакрытыкі, як некаторым памылкова здаецца, павінна паступова зьмяншацца.

Пленум ЦК УсеКП(б), а таксама і Пленум ЦК КП(б)Б адзначылі, што самакрытыка месцамі яшчэ не распачата і не разгарнулася да належных разьмераў, не захапіла як трэба шырокія рабоча-сялянскія масы.

Разгортваньне самакрытыкі ў поўнай меры застаецца і зараз адной з галоўных задач.

Разам з гэтым трэба адзначыць і некаторую аднабокасьць, з якою праводзілася самакрытыка, і ня зусім нармальныя адносіны да самакрытыкі тых, хто зьяўляўся яе аб'ектам.

Звычайна крытычныя выступленьні на сходах ці ў друку мелі чыста «аблічыцельны» характар. Залішне выпукляліся факты хібаў, злачынстваў і рэдка выносіліся канкрэтныя прапазіцыі да зьнішчэньня гэтых недахопаў.

Аб'ект крытыкі быў зацікаўлен, галоўным чынам, ня тым, каб паправіць свае памылкі і выправіць лінію, а ўсе свае здольнасьці, усю сваю лоўкасьць скарыстоўваў на «абвяржэньні», на замазваньне фактаў, на «адпіску».

Частка працаўнікоў пад уплывам самакрытыкі пачала хварэць „масабаязьнью" і з залішняй злосьцю і нэрвовасьцю адказвала на спробы мас ажыцьцяўляць свой кантроль.

Асабліва-ж ненармальныя адносіны ўтварыліся паміж гаспадарнікамі і працаўнікамі друку. Рабкор, селькор, газэтны рэпартэр зрабіліся для першых «жупелам і пугалам», ад якіх можна чакаць усякіх «паклёпаў», ад якіх так цяжка адхрысьціцца нават «таленавітымі» абвяржэньнямі.

Калі крытыкуючая маса і яе рупар—прэса—дапушчалі некаторую аднабаковасьць з тэндэнцыяй на бязьлітаснае і «чистое обличение», дык аб'ект крытыкі вёў сябе дрэнна тым, што толькі «абвяргаў», а каб прыняць актыўны ўдзел ў самакрытыцы, каб сьвядома і сумленна дапамагчы ёй—ён і ня думаў.

Ясна, што такое ўзаемнае непаразуменьне — зьявішча далёка ненармальнае, і ў далейшым аднэй з галоўных нашых задач, асабліва задач прэсы, павінна быць рацыяналізацыя самакрытыкі.

Як мы разумеем гэтую рацыяналізацыю?

Разгортваючы далей самакрытыку, бязьлітасна выкарчоўваючы ўсё, што зьяўляецца перашкодай на шляху нашага сацыялістычнага будаўніцтва, мы павінны настайваць на тым, каб у крытычным матар'яле, ці будзе гэта выступленьне на сходзе, ці артыкул у газэту, ці акт працаўніка РСІ, акрамя фактаў „аблічыцельнага" характару, былі неабходныя практычныя вывады і прапазыцыі для выпраўленьня памылак у далейшым.

Побач са стаўкай на актыўны ўдзел у самакрытыцы шырокіх мас мы павінны настайваць на неабходнасьці шырокага ўдзелу ў правядзеньні самакрытыкі з боку тых, хто да гэтага часу з вялікай абразай глядзеў на сябе, як на аб'ект крытыкі. Вялікі вопыт і спэцыяльная падрыхтоўка іх у розных галінах нашага будаўніцтва дапамогуць шырокім масам з большай лёгкасьцю вырашыць тыя задачы, якія ставіць перад сабою самакрытыка.

Узмацненьне і разгортваньне самакрытыкі разам з рацыяналізацыяй самакрытыкі павінна зрабіць з яе яшчэ больш моцны сродак выпраўленьня нашых хібаў ва ўсіх галінах працы і падрыхтаваць глебу для ўзмацненьня тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва.

Гэта павінны добра ведаць і шырокія рабоча-сялянскія масы, «падкантрольныя» ім кіраўнікі і актыўныя ўдзельнікі нашага будаўніцтва, і асабліва работнікі прэсы, на якіх ляжыць адказная роля выяўленьня і фіксаваньня крытыкуючага голасу мас.

У ГІШПАНІІ ВЫКРЫТА РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ЗМОВА.

ПАРЫЖ, 12-9. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Джорналь» зьмяшчае затрыманую ў дарозе тэлеграму з Мадрыду аб няўдалай спробе рэвалюцыйнае змовы з мэтаю скінуць дырэкторыю. Учынена 200 арыштаў, пераважна, у Мадрыдзе, Барсалёне, Валенсі, Сарагосе і інш. У ліку арыштаваных—лідэр рэспубліканскае партыі Лару, два ранейшых рэспубліканскіх дэпутаты—Вар'ёдэро і Асаты, некалькі журналістаў і франкмасонаў.

Арышты не сунімаюцца. Рада міністраў ухваліла арыштаваць ранейшага старшыню рады міністраў Санчэс-Гера, які выехаў у Францыю, і ранейшага міністра Камбо, які знаходзіцца ў сучасны момант заграніцаю.

«Пці Журналь» паведамляе з Барсалёны, што змова шырока была разгорнена ў Сарагосе, дзе арыштавана шмат салдат і афіцэраў. Згодна загаду ўраду ўведзена цэнзура.

На рэйках сапраўднае клясавае барацьбы.

НОВЫ ЛЕВЫ ПРАФСАЮЗ АМЭРЫКАНСКІХ ГАРНЯКОЎ.

НЬЮ-ЁРК, 12-9. Заснаваны ў Пітбурзе новы саюз гарнякоў левага напрамку пад назваю «нацыянальны саюз гарнарабочых» агаласіў адозву да ўсіх гарнякоў з заклікам уваходзіць у новы саюз. Адозва прапануе гарнякам выйсьці з „аб'яднанага саюзу гарнякоў Амэрыкі", якім кіруе рэакцыянэр Льюіс, і не прызнаваць згоды аб зьніжэньні заработку, падпісанае прадстаўнікамі гэтага саюзу.

Далей адозва заклікае гарнякоў змагацца проці сыстэмы выплаў прафсаюзных узносаў з заработку, якая дае магчымасьць бюракратам льюісаўскага саюзу гаспадараць узносы праз прадпрыёмцаў. Адозва заўважае, што новы саюз будзе вітаць далучэньне да сваіх радоў гарнякоў-мурыноў.

Канфэрэнцыя ў Пітбурзе, на якой ухвалена арганізаваць новы саюз, ухваліла рэвалюцыю на нарысьць заснаваньня ў Амэрыцы рабочае партыі і проці клясавага супрацоўніцтва.

Левы гарнак Джордж Маран, у якога на мінулым тыдні страляў адзін з дзвючой саюзу Льюіса, памёр ад рану больніцы. Двое іншых параненых разам з Маранам ачуняюць.

Пілсудчына робіць выклік СССР.

Курс на агрэсію проці Савецкае Украіны.

„Палітыка далёкага прыцэлу" Залескага.

ВЕНА, 12-9. «Нэйе Вінэр Журналь» зьмяшчае гутарку з Залескім, які, між іншым, заявіў: «Некаторыя вобласьці і дзяржавы, у тым ліку і Польшча, знаходзяцца ў выключным становішчы і павінны, з гэтае прычыны, самі шукаць загадзя шляхоў і сродкаў, каб ухіліцца ад варожых апэрацый. Суседзтва з Расеяй часта стварае Польшчы клопат. Польшча павінна абараняць сябе ад пахожых на нядаўнія выступленьні, якія перашкаджаюць міралюбнай польска-савецкай згодзе. З другога боку, гэтае здарэньне зьяўляецца ў вядомай меры карысным, бо Польшча прынамсі ведае, чаго яна можа чакаць з расейскага боку. Аднак, Польшча мала занепакоена маскоўскаю прапагандаю, бо камунізм у Расеі паступова траціць глебу. Нацыянальныя-ж маскоўскія сродкі ня страшны бо нацыянальныя меншасьці Польшчы ведаюць, што саветы не захоплены нацыяналісцкімі ідэаламі».

Далей Залескі адказаў станоўча на запытаньне прадстаўніка газэты, «ці бачыць ён у СССР сур'ёзныя перашкоды да ўсеагульнага міру і ўсеагульнага разброеньня».

Пахабнае выступленьне падонка пятлюраўшчыны.

ВАРШАВА, 12-9. У апошні час пілсудчыкі зварочваюць асаблівую ўвагу на Валынь, як апорны пункт іх украінскае палітыкі. Новы валынскі ваявода Юзэфскі быў у мінуўшчыне сябрам ураду Пятлюры.

Газэта «Земя Любэльска» падае прамову ваяводы Юзэфскага. Ваявода закрануў у сваёй прамове пытаньне аб Валыні, заяўляючы, што ён яго датыкаецца, маючы на гэтае права, як удзельнік вызваленчае барацьбы і ад сьцягамі Пілсудзкага і як удзельнік барацьбы за незалежнасьць Украіны ў якасьці сябра ўраду Пятлюры. Юзэфскі лічыць, што няма ніякае супярэчнасьці між канцэпцыяй незалежнасьці Украіны і захаваньнем Валыні цалкам і беспаваротна за Польшчаю. «Украінец, — сказаў Юзэфскі—які спрыяе польска-украінскаму зблiжэньню на Валыні, не знаходзіцца ў супярэчнасьці з ідэяй незалежнасьці Украіны, якая знаходзіцца ў суседзтве з гэтай тэрыторыяй. Гэта добра разумеў Пятлюра, які ведаў, што існуе вялічэзная розьніца ва ўзаемадачыненьнях—«Масква-Кіеў» і «Кіеў-Варшава». Першыя грунтуюцца на адмове права на існаваньне. Узаемаадносіны-ж—„Варшава-Кіеў"—будуць грунтавацца на культурных спаборніцтвах у гаспадарчай і духоўнай экспансіі".

Далей ваявода заявіў: «Трэба змагацца з усім, што перашкаджае гэтай канцэпцыі. Мы павінны паралізаваць усіх, хто супярэчыць ажыцьцяўленьню гэтае канцэпцыі. Як мы гэта зробім, гэта—справа мэтадаў. Мэтады могуць быць розныя, у залежнасьці ад патрабаваньняў моманту. Галоўнае, гэта—ня трацiць асноўнага напрамку, абавязковага для ўсіх польскіх грамадзян на Валыні, якія зьяўляюцца прыхільнікамі права украінскага народу на самастойнае існаваньне ў добрым суседзтве з Польшчаю».

«Газэта Варшавска», абмяркоўваючы прамову Юзэфскага, лічыць гэтае выступленьне «нязвычайным». У інтарэсах польскае дзяржавы і яе аўтарытэту, «Газэта Варшавска» лічыць патрэбным, у зьвязку з прамоваю Юзэфскага, узьняць такія тры пытаньні: «папершае, з якога часу валынскі ваявода замяшчае польскага міністра замежных спраў і замяшчае сабой польскі ўрад у выступленьнях, якія закранаюць міжнародную палітыку; падругое, ці ведае Залескі і ці згодзен ён з праграмаю украінскае палітыкі, высунутаю валынскім ваяводам і, патрэцяе, чаму міністр унутраных спраў ня даў яшчэ да гэтага часу адстаўкі Юзэфскаму?».

Афіцыёзнае адхіленьне антысавецкае маны.

ВАРШАВА, 12-9. У зьвязку з хлусьлівай інфармацыяй у польскім друку, нібыта гандлёвае прадстаўніцтва СССР у Варшаве дастаўляла нелегальную літаратуру зачыненаму гэтымі днямі кніжнаму выдавецтву «Россика», у афіцыёзае «Эпока» зьмешчана афіцыёзнае адхіленьне, у якім зазначаецца, што літаратура ў гандлёвае прадстаўніцтва прысылася нармальным і законным парадкам.

Антысавецкія мэты нажыму на Нямеччыну

СПРОБА ПАДНАЧАЛІЦЬ НЯМЕЦКУЮ ЗАМЕЖНУЮ ПАЛІТЫКУ ПЛЯНАМ АНГЛА-ФРАНЦУСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ.

Новае ў ацэнцы выступленьня Брыяна.

ПАРЫЖ, 12-9. У асьвядомленых журналісцкіх колах зазначаюць, што ЛЁС ФРАНКА-НЯМЕЦКАГА ЗБЛІЖЭНЬНЯ І, МІЖ ІНШЫМ, ЛЁС ПЕРАМОЎ АБ РЭЙНСКАЕ ВОБЛАСЬЦІ ЗАЛЕЖЫЦЬ не ад згоды Нямеччыны на тыя ці іншыя паасобныя кампэнсацыі фінансавага ці нават палітычнага характару, а АД АГУЛЬНАГА НАПРАМКУ НЯМЕЦКАЕ ПАЛІТЫКІ І АД ЗГОДЫ НЯМЕЧЧЫНЫ ДАЛУЧЫЦЦА ДА АНГЛА-ФРАНЦУСКАГА БЛЁКУ, З АДПАВЕДНЫМІ ВЫВАДАМІ Ў ГАЛІНЕ ЎСХОДНЯЕ, БАЛКАНСКАЕ І ІТАЛЬЯНСКАЕ ПАЛІТЫКІ БЭРЛІНСКАГА ГАБІНЭТУ.

Жэнэўскі карэспандэнт «Пці Парызьен» піша: „На нарадзе шасьці дзяржаў быў заслухан нямецкі пункт гледжаньня, водлуг якога патрабаваньне неадкладнае эвакуацыі Рэйнскае вобласьці зьяўляецца бясспрэчным правам Нямеччыны. Потым быў выслухан процілежны пункт гледжаньня, які грунтуецца на патрабаваньні палітычных, ваенных і фінансавых гарантый і тых эквівалентаў, якіх саюзьнікі маюць права дамагацца як з пункту гледжаньня бэзапасьнасьці, так і з пункту гледжаньня рэпарацый. Больш замірэнчая пазыцыя, занятая ў канцы нарад нямецкім канцлерам, даводзіць, што прамова Брыяна і выкліканыя ёю тлумачэньні прагучэлі своячасна».

„АНГЛІЯ БУДЗЕ ЎДЗЯЧНА БРЫЯНУ".

РЫМ. Дыплёматычныя колы спаткалі прамову Брыяна ў Жэневе з выразнаю ўхвалою. Асаблівае значэньне надаецца таму, што Брыян у гутарцы пасьля гэтага з журналістамі не памыкаўся зьмякчыць сэнс сваёй прамовы. У газэтах няма больш намёкаў, што Нямеччыне карысна шукаць саюзьніка на поўдні.

Газэта «Ляворо-д' Італія», спыняючыся на «антысавецкай дывэрсіі» Брыяна, піша; «Напамінаньне аб сацыяльным міры было зроблена, каб зрабіць уражаньне на сход выключна буржуазных прадстаўнікоў, але разам з тым ня было пазбаўлена палітычнага сэнсу. Англія будзе ўдзячна Брыяну за абкружэньне СССР новым калючым дротам. Нямеччына атрымала папярэджаньне, што надзвычайнае захапленьне ўсходняй арыентацыяй выклікае расчараваньні на захадзе».

Прамова Брыяна была пагоджана з Залескім?

ВАРШАВА, 12-IX. Прамова Брыяна на пленуме Лігі Нацый жвава абмяркоўваецца ўсім варшаўскім друкам. Частка друку, зусім не разводзячы крытыку, ацэньвае прамову з уздымам, ледзь ня як перамогу польскае дыплёматыі. Некаторыя газэты намякаюць, што нібыта прамова была зроблена непасрэдна пасьля размовы Брыяна з Залескім і нібы яна была пагоджана з Залескім.

Больш стрыманыя публіцысты, аднак, перасьцерагаюць ад лішняга аптымізму, зазначаючы, што Брыян «сапраўды атакаваў нямецкіх палітычных дзеячоў у пытаньні аб разброеньні і аб нацыянальных меншасьцях. Аднак, ён не памянуў ніводным словам такога пытаньня, як, напрыклад, эвакуацыя Рэйнскае вобласьці, якая зьяўляецца галоўнаю тэмаю дню сучасных перамоў». На думку гэтых газэт, гарміідар навакол прамовы Брыяна ўзьнаты нямецкімі газэтамі знарок. На справе-ж шлях для далейшых перамоў не перацяты.

НА НАРАДЗЕ АБ ЭВАКУАЦЫІ РЭЙНСКАЕ ВОБЛАСЬЦІ.

МЮЛЬЛЕР АДСТУПАЕ.

БЭРЛІН, 12-9. У перамовах на жэнэўскай нарадзе пяці дзяржаў аб эвакуацыі Рэйнскае вобласьці нямецкая дэлегацыя зазначала, што Нямеччына прынцыпова не прызнае залежнасьці пытаньня аб эвакуацыі ад пытаньня аб уладжаньні фінансавых абавязацельстваў, але ўсё-такі згодна адначасна з перамовамі аб эвакуацыі весьці раўналежныя перамовы і па пытаньнях рэпарацый (фінансавых выплат дзяржавам-пераможцам у імпэрыялістычнай вайне).

ТАЙНАЯ ДЫПЛЁМАТЫЯ Ў ХОДЗЕ.

БЭРЛІН. У палітычных колах падкрэсьліваюць, што да ўдзелу ў нарадзе дзяржаў у Жэневе па пытаньні аб эвакуацыі Рэйнскае вобласьці ў апошнюю хвіліну быў запрошан прадстаўнік Японіі. Такім парадкам, на канфэрэнцыі прысутнічаюць усе ўдзельнікі канфэрэнцыі паслоў.

Перад нарадаю адбылося супольнае сьнеданьне Брыяна і Банкура з прадстаўнікамі дзяржаў Малое Антанты, а таксама Польшчы. Гэта ставіцца ў нямецкіх палітычных колах у сувязь з нарадаю па пытаньні аб эвакуацыі.

Адносіны асобных нямецкіх партый да апошніх абставін.

Бэрлін, 12-9. Народная партыя аднеслася адмоўна да прамовы Брыяна; сацыял-дэмакраты, не зважаючы на крытыку прамовы Брыяна, выказаліся за далейшую палітыку пагоджанасьці з Францыяй, дэмакратычная партыя і цэнтр таксама.

Загад панцырных сацыялістаў сваёй „арміі".

БЭРЛІН, 12-9. Пленум ЦК сацыял-дэмакратычнае партыі ўхваліў пастанову, якой падкрэсьліваецца, што ўсенароднае галасаваньне не падыходзіць для вырашэньня пытаньня аб пабудове панцырнага крэйсэра.

„Камуністы,—зазначана ў пастанове,—бачаць ва ўсенародным галасаваньні магчымасьць узьвесьці паклён на сацыял-дэмакратычную партыю. З гэтае прычыны абавязак кожнага сябра сацыял-дэмакратычнае партыі рашуча выступіць проці кампаніі за «ўсенароднае галасаваньне».

Далей выказваецца надзея, што прынцыповая пазыцыя партыі ў пытаньні аб узброеньнях будзе ўстаноўлена партыйным зьездам у лютым 1929 г.

Кешэндэн—толькі падгалосак Брыяна.

ЛЁНДАН, 12-9. «Манчэстэр Гардыян» наконт прамовы Кешэндэна на пленуме Лігі Нацый піша: «Кешэндэн у працягу ўсяго часу жэнэўскіх пасяджэньняў зьяўляўся ня шмат чым больш, як падгалоскам Брыяна».

«Дэйлі Геральд» піша: „Кешэндэн паглыбіў найгоршыя ўражаньні ад прамовы Брыяна. Цяпер зразумела, што ангельскі і францускі ўрады ня хочуць, каб адбылася канфэрэнцыя аб разброеньні».

„ПАЧАТАК НОВАЕ ПАЛІТЫКІ".

Запозьненае абурэньне «Кёльнішэ Цэйтунг».

БЭРЛІН, 12-9. „Кёльнішэ Цэйтунг", абмяркоўваючы сучаснае становішча ў Жэневе, піша: „Ёсьць толькі адзін выхад з сучаснага становішча: запакаваць чамаданы. Прынамсі, гэтым можна заявіць адкрыты пратэст проці ганебных паводзін і пакінуць Жэневу, бо толькі падкрэсьліўшы такім парадкам свой уласны чалавечы гонар і гонар нямецкае нацыі можна прымусіць адумацца і процілеглы бок".

Лёндансі карэспандэнт газэты паведамляе: «Прамова Брыяна была зроблена бясспрэчна са згоды ангельскіх дзяржаўных дзеячоў. Сэнсацыйнае ўражаньне прамовы было загадзя разьлічана. Для тых, хто сачыў за развіцьцём англа-францускае палітыкі ў апошні час, прамова Брыяна ўяўляецца адкрытаю заяваю з міжнароднае трыбуны аб пачатку новае палітыкі".

ЭКАНАМІЧНЫ ЗАНЯПАД КІТАЮ.

У ПЕКІНЕ ПРАДПРЫЁМСТВЫ ЗАЧЫНЯЮЦЦА СОТНЯМІ.

ПЕКІН, 12-9. Дэлегацыя ад 7-мі тысяч сем'яў беспрацоўных чыноўнікаў, якія служылі пры ранейшым урадзе, наведалася да мэра Пекіну і перадала яму пэтыцыю з просьбаю аб дапамозе. Улада абяцала дэлегацыі даць ранейшым чыноўнікам вольны праезд на бацькаўшчыну (пераважна, на поўдзень).

Чыноўнікі на пасадах таксама вельмі нездаволены з прычыны зьмяншэньня пэнсіі, якая выплачваецца ляшчэ і ня поўнасьцю.

Эканамічны крызіс у Пекіне абвастраецца. За ліпень было зачынена блізка 800 гандлёвых прадпрыёмстваў, за жнівень—500.

ЦЯЖКІ СТАН ШКОЛ.

ПЕКІН, 12-IX. Газэта «Пекін Лідэр», падкрэсьлівае цяжкае фінансавае становішча кітайскіх школ. Газэта піша: „Дзякуючы перадаванай расейскай частцы боксэрскае кантрыбуцыі, якая перадавалася Кітаю, настаўнікі атрымлівалі акуратна пэнсію. Але з прыходам нацыяналістаў гэтая крыніца спыніла моц".

Японія гаспадарыць у Шандуні.

ШАНХАЙ, 12-9. Фынь-юй-сянаўскае агенцтва «Тачун» паведамляе, што начальнік японскага гарнізону ў Цзынані абвясьціў ваеннае становішча ў горадзе. Японскі гарнізон у горадзе ўзмоцнен новымі вайсковымі часьцямі.

15 савецкіх грамадзян апраўданы.

АПРАЎДАНЫ ПАСЬЛЯ 17-ЦІ М-ЦАЎ БЯЗЬВІННАГА ЗЬНЯВОЛЕНЬНЯ.

ПЕКІН, 12-9. Пракурор пекінскага суду выкінуў да сябе 15 савецкіх грамадзян, вызваленых пасьля 17-цімесячнага зьняволеньня ў Пекіне, і афіцыйна абвясьціў ім пастанову суду па іх справе. Пастанова суду кажа, што 14 грамадзян карыстаюцца правамі дыплёматычнае недатычнасьці, бо яны былі супрацоўнікамі савецкага консульства ў Пекіне; з гэтае прычыны справа проці іх спынена. Што-ж датычыць 15 абвінавачанага (т. Скаткіна), дык суд прызнаў, што проці яго няма ніякіх доказаў абвінавачаньня і апраўдаў яго.

У Саюзе ССР.

Пахаваньне т. Лашэвіча.

ЛЕНІНГРАД, 12-9. А 12-й гадз. труна з целам т. Лашэвіча прынесена да палацу Урыцкага. На самой труне ляжыць вялікі вянок з чырвоных ліляў ад ЦК УсеКП(б). Труну на руках уносяць у залю т. т. Кубяк, Зіноўеў, Еўдакімаў, Тухачэўскі, Бакаеў, Залуцкі і інш. і пры гуках жалобнага маршу ставяць на памост.

Ля труны ў палацы Урыцкага ўстанаўляецца ганаровая варта. У працягу 3-х гадзін бязупынна праходзяць ленінградзкія рабочыя, чырвонаармейцы і грамадзяне ля труны, аддаючы апошні доўг нябожчыку.

А 15-й гадз. 30 хвіл. таварышы Лашэвіча па рэвалюцыйнай працы выносяць труну з целам т. Лашэвіча і становяць на чырвоны лафет. Працэсія ідзе на пляц Ахвяр Рэвалюцыі.

А 17-й гадз. жалобная працэсія прыходзіць на пляц Ахвяр Рэвалюцыі і набліжаецца да братэрскіх магіл.

Ля выкананае магілы было сказана некалькі прамоў. Ад імя ЦК УсеКП(б) выступае т. Кубяк. „У асобе нябожчыка,—кажа ён,—партыя страціла аднаго з лепшых сваіх сыноў, аднаго з лепшых абаронцаў рабочае справы, аднаго з лепшых будаўнікоў сацыялізму. Рабочая клясса страціла ў асобе Лашэвіча шчырага агітатара і будаўніка новага сацыялістычнага жыцьця. Перад адкрытаю магілаю ня трэба ўспамінаць памылкі Лашэвіча, калі ён адышоў ад партыі. Гэта была кароткачасовая памылка, ён хутка ізноў вярнуўся ў рады партыі і з тою-ж энэргіяй і адвагаю пачаў ажыцьцяўляць партыйныя заданьні на Далёкім Усходзе, на самым адказным вучастку.

Ад імя абласнога камітэту УсеКП(б) і абласнога выканкому слова разьвітаньня мае Бакаеў. Сябра праўленьня Усходня-Кітайскае чыгункі Чэн-Шы-Мо выступіў ад імя праўленьня чыгункі. Ад імя Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР і Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету Ленінградзкага ваеннага вокругу выступіў т. Тухачэўскі.

Роўна а 18-й гадз. пры салютах гармат і вітавак труна з целам Лашэвіча спушчаецца ў магілу.

Шматтысячная працэсія, якая праводзіла труну, павольна праходзіць каля магілы са схіленымі сьцягамі.

Генэральная праверка баявое магутнасьці.

Гарачыя „бойкі" за Кіеў.

КІЕЎ, 11-9. Уначы перад 11 верасьня на Кіеў наскочылі «варожыя» самалёты. Атрымаўшы паведамленьне аб набліжэньні „ворага", пражэктары пачалі перакрыжоўваць неба сваімі прамянямі. Хутка на белай палосе аднаго з пражэктараў зьявіўся самалёт «ворага», які дзяэмна хацеў выбрацца з палясы. У першы дзень «ворага» «нацэліўся» у цэнтральную электрастанцыю з намерам пазбавіць жыхароства сьвету і вады. Паняраджаная электрастанцыя пасьпела сунець свае дывэлі і горад апынуўся ўпацёмках. Выбухнуўшым ля станцыі снарадам «параўена» трое. Другая «бомба» выбухнула ля памяшканьня цэнтральнага тэлеграфу, але тэлеграф ня спыняў працы. Тут таксама трое «параненых».

А 2 гадзіне ночы на тэрыторыю „Краснознаменного завода" самалёт ворага кінуў 3 бомбы. Здарыўся „пажар". Пажарныя каманды гораду разам з мясцовымі камандамі ў працягу 30 хвілін затушылі агонь. Тут таксама было трое «параненых». Мясцовасьць на 30 мэтраў навакол была «запаганена» газам.

На заводзе «Большевик» было скінута 3 бомб, якія ўчынілі вялікія „зруйнаваньні". Газам атручана 200 мэтраў пашчы. Узьнікшы «пажар» хутка быў спынены. Ёсьць „параненыя" і «атручаныя».

Распачаліся манэўры Чорнаморскага флёту.

СЕВАСТОПАЛЬ, 12-9. Распачаліся манэўры Чорнаморскага флёту. Баявыя караблі «чырвоных» і «сініх» вышлі на свае пункты. Над эскадрамі—самалёты. Фарты крэпасьці і рабочыя батальёны рыхтуюцца адбіваць ворага.

Сьвяткаваньне 10-цігодзьдзя слаўнае Чапаеўскае.

ПАЛТАВА, 11-IX. У лягерах адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне 10-цігодзьдзя Чапаеўскае Чырвонасьцяжнае дывізіі. На сьвята, апроч старых чапаеўцаў, рабочых і сялянскіх дэлегацый прыехаў тав. Пятроўскі, які прыняў парад дывізіі і перадаў дывізіі ад імя Усеукраінскага ЦВК чырвоны сьцяг.

Тав. Пятроўскі абраны ганаровым чырвонаармейцам.

Хітрыкі ня выратуюць прыватніка.

ЗЬМЕНЫ Ў ЗАКОНЕ АБ ПАДАТКУ НА ПРЫБЫТАК.

МАСКВА. Прэзыдыум ЦВК Саюзу ССР зацьвердзіў пададзены саюзным СНК законапраект аб зьменах у падатку на прыбытак. Гэтыя зьмены выкліканы неабходнасьцю найбольш поўна вылічыць усе прыбытні выплатчыкаў падатку і ўхіліцца ад усіх хітрыкаў прыватніка, якія ёй ужываюць, каб ашукаць фінорганы. Між іншым, у апошні час прыватныя асобы шырока практыкуюць супольнае ўласьніцтва асоб, якія знаходзяцца ў шлюбе ці сваяцтве. Гэтае супольнае ўласьніцтва раздрабляе агульны прыбытак прадпрыёмства і ў асобных выпадках зьніжае агульную суму падатковага абкладаньня, ускладняючы самы збор падатку.

У зьвязку з гэтым пастанова прадугледжвае, што прыбытак ад гандлёвага ці прамысловага прадпрыёмства асоб, якія знаходзяцца паміж сабою ў шлюбе ці сваяцтве па простай лініі, лічыцца прыбыткам аднае з гэтых асоб і экраз тае, якую вызначыць вучастковая падатковая камісія.

Італьянскія судны спынілі адшуканьне Александры.

РЫМ, 12-9. Агенцтва Стэфані паведамляе: «Росшукі «Красіна», «Браганца» і «Хейфлянда» ў апошні час не далі ніякіх вынікаў. У зьвязку з гэтым, з прычыны надышоўшае восені і няспрыяючых для паветраных разведак атмасфэрных умоў, «Браганца» вызваляецца ад далейшага ўдзелу ў адшуканьнях, а 15-га верасьня «Чыта-ды-Мілана» таксама адплывае з Шпіцбэргену».

Толькі адзін „Красін" ня спыніць адшуканьня.

ЛЁДАКОЛ «КРАСІН», 11-9. Начальнік італьянскае экспэдыцыі Романья паведаміў, што італьянскі ўрад пастанавіў вызваліць ад далейшага адшуканьня трэцяе групы экспэдыцыі Нобіле параход «Браганцу», які ў хуткім часе адплыве ў Нарвэгію. Гэтымі днямі, пагрузіўшы вугаль, адплыве і «Чытта-ды-Мілана».

Адыход італьянскае экспэдыцыі з самалётамі абцяжвае працу экспэдыцыі «Красіна». Тым ня менш, кіраўніцтва экспэдыцыяю пастанавіла ня спыняць працы, пакуль дазволіць надвор'е.

Старту чакаюць увечары або заўтра раніцою.

ЗАДАЧЫ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ (б) БЕЛАРУСІ НА БЛІЖЭЙШЫ ПЭРЫЯД

Рэзалюцыя верасьнеўскага Пленуму ЦК КП(б)Б.

Вясеньня-летні пэрыяд бягучага году характарызуецца: а) завастрэньнем цяжкасьцяй, зьвязаных з сацыялістычнай рэканструкцыяй нашае гаспадаркі; б) шпаркім ростам палітычнай актыўнасьці ўсіх без выключэньня груп насельніцтва (рабочых, усіх пластоў сялян, дробнай буржуазеі і г. д.) і в) завастрэньнем клясавай барацьбы як у горадзе, так і ў асабліваści ў вёсцы.

Асноўнымі момантамі, на якіх канцэнтравалася ўвага мас за гэты пэрыяд, былі:

а) далейшае разгортваньне сацыялістычнай прамысловасьці і будаўніцтва і барацьба партыі і рабочых мас за паляпшэньне плянаваньня, за зьніжэньне сабекошту прамысловай прадукцыі—паляпшэньне якасьці будаўнічых работ;

б) труднасьці ў дастаўцы хлеба пралетарыяту і вясковай і местачковай беднаце;

в) веснавая і асеньняя пасеўныя кампаніі;

г) разгортваньне калгаснага і савгаснага будаўніцтва;

д) скарачэньне ролі прыватнага гандляра і дробнага гарадзкога і местачковага прадпрыёмцы-прыватніка;

е) барацьба з бюракратызмам і за палепшаньне дзяржаўнага апарату на грунце разьвіцьця самакрытыкі.

У сувязі з гэтымі момантамі наша арганізацыя падышла да самых найбольш цяжкіх праблем сацыялістычнага будаўніцтва, дзеля вырашэньня якіх у абставінах росту актыўнасьці ўсіх груп насельніцтва неабходна было яшчэ больш шпаркае і больш рашучае зжываньне нашых арганізацыйных недахопаў, адхіленьне будаўнічых дэфэктаў і злоўжываньняў, узьнацьце сацыялістычнай актыўнасьці, клясавай сьвядомасьці, культурнасьці рабочых мас, лепшая арганізацыя рабочай клясы і вясковай беднаты на барацьбу проціў кулацка-буржуазных элемэнтаў, абапіраючыся на саюз з сярэднім сялянством.

I. Палітычныя вынікі вясеньня-летняга пэрыяду.

1. Сацыялістычнае будаўніцтва за гэты пэрыяд часу сустрэлася з радам досыць сур'ёзных труднасьцяў. Побач з нездавальняючым нас тэмпам прамысловага разьвіцьця выявілася частковая неадпаведнасьць разьвіцьця прамысловасьці і сельскае гаспадаркі, што паказала сабе як у цяжкасьцях з хлебазагатоўкамі, так і ў недахопе сыравіны для раду галін прамысловасьці (ільняная, скураная, масларобчая, крахмальна-патачная і г. д.). Для пасьпяховага разгортаньня прамысловасьці і для адхіленьня перабояў у працы прамысловасьці сырцовая праблема павінна зьвярнуць на сябе значна большую ўвагу. Побач з гэтымі труднасьцямі, якія вынікаюць з аб'ектыўных умоў пераходнага пэрыяду, выявіліся буйныя недахопы ў нашай рабоце па капітальным будаўніцтве, зьвязаныя в недахопамі праектаваньня новых прадпрыёмстваў, нядбайнасьцю ў складаньні плянаў (гарбарня «Бальшавік», «Гэрой Працы», лясны камбінат і г. д.) і спазьненьнем плянаў (унівэрсытэт) і з недахопам практычных і падрыхтаваных кадраў гаспадарнікаў і адданых пралетарыяту інжынэрна-тэхнічных сіл. Усе гэтыя недахопы асабліва востра выявіліся дзякуючы культурнаму і палітычнаму росту рабочае клясы, дзякуючы росту ў рабочых масах пачуцьця адказнасьці за сацыялістычнае будаўніцтва. Далейшы рост сацыялістычнай сьвядомасьці рабочае клясы, разгортваньне рабочай самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі забясьпечыць адхіленьне існуючых недахопаў, замадуе пазіцыі рабочае клясы ў краіне і дасьць рашучую перамогу над клясава-варожымі пралетарыяту сіламі.

2. Труднасьці ў забезьпячэньні гарадоў і вясковай беднаты былі выкліканы агульна-саюзным крызісам хлебазагатовак мінулага году, які зьяўляецца вынікам аб'ектыўных абставін рэканструкцыйнага пэрыяду і завастрэньня клясавае барацьбы ў краіне (сабатаж кулака). Завастрэньне ў чэрвені і ліпені хлебных труднасьцяй у гарадох БССР аднак-жа было выклікана ня толькі гэтымі агульнымі прычынамі, але ўзмацнілася ў значнай меры з поваду недастасаванасьці апарату хлебапячэньня да забесьпячэньня ўсяго насельніцтва выпечаным хлебам і невыстарчальнай дастасаванасьці апарату раздачы хлеба насельніцтву, каб шпарка перайсьці да такога спосабу разьдзяленьня хлеба, пры якім ў першую чаргу былі-б здаволены рабочыя, і была-б адхілена перапрадажа і нерацыянальнае выдаткаваньне хлеба. Партыйнымі і прафсаюзнымі органамі ня былі своечасова ўжыты меры па растлумачэньні рабочым сапраўдных труднасьцяй і іх прычын, што ў радзе выпадкаў прывяло да панікі нават сярод паасобных груп рабочых. Аднак, ужытымі ў часе самых труднасьцяй арганізацыйнымі мерапрыёмствамі і праведзенай работай па растлумачэньні была забясьпечана здавальняючая дастаўка хлеба рабочым і быў створаны ў рабочай клясе ўстойлівы і прыхільны партыі настрой. Выклікананае скарачэньне у летнія месяцы, у параўнаньні з мінулымі месяцамі, прывозу хлеба частковае і часовае спыненьне дастаўкі хлеба ў вёску стварыла вострыя труднасьці ў некаторых сельскіх раёнах і мясточках. Гэтай акалічнасьцю прабавала скарыстацца кулацтва для выступленьня проціў беднаты і мерапрыёмстваў савецкае ўлады па яе арганізацыі (спробы не прадаваць хлеба актывістам, актыўным удзельнікам правядзеньня самаабкладаньня і г. д.), а таксама для контр-рэвалюцыйнай арганізацыі ў масах (чуткі аб абвяшчэньні вайны, увядзеньне картак і г. д.). Аднак, кулаку не ўдалося паставіць беднату проціў савецкай улады, а выпадкі канфліктаў і сутычак за недахоп хлеба (якія мелі месца) ня могуць быць вытлумачаны, як палітычнае недавер'е вясковай беднаты да савецкай улады і партыі. Асноўныя масы серадняковай Беларусі ня былі закрануты загатоўкамі і, пасьля скончэньня вясеньніх фінансавых эканамічных мерапрыёмстваў, ня выявілі значных палітычных хістаньняў. Дзеля гэтага труднасьці ў хлебазабесьпячэньні не пагоршылі суадносін клясавых сіл у вёсцы, а ўзмоцненая ў сувязі з гэтым клясавая барацьба паміж беднатой і кулацтвам скончылася карысна для пралетарыяту... Аднак, гэты вынік мог-бы быць лепшым пры лепшай арганізацыі беднаты і большым скарыстаньні кампаніі для арганізацыйнага згуртаваньня і выхаваньня беднаты і больш выразнай працы нізавога савецкага апарату.

3. Вясеньняя пасяўная кампанія, праведзеная пад лёзунгам ажыцьцяўленьня дырэктыў ХУ зьезду УсеКП(б), пры максымальнай увазе ўсіх партыйных арганізацый ня толькі адхіліла няпрыхільнае ўражаньне першага перыяду хлебных затрудненьняў і ўжыцьцё адміністрацыйных мерапрыёмстваў пры правядзеньні фінансава-эканамічных кампаній, але ўзмацніла яшчэ больш саюз рабочае клясы і вясковай беднаты з сярэднім сялянством. Шырока разгорнутая работа па забясьпечаньні сялян насеньнем, угнаеньнем і сельска-гаспадарчымі машынамі, шырокае крэдытаваньне беднаты і серадняку паказала, што курс на прысьпяшэньне тэмпу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі (калгаснае будаўніцтва, савгасы) азначае не паслабленьне ўвагі да індывідуальнае сялянскае гаспадаркі, а агульнае ўзмацненьне ўвагі да пытаньняў сельскае гаспадаркі, да падняцьця прадукцыйнасьці, культурнасьці і тэхнічнага ўзроўню сялянскае гаспадаркі пры адначасовым прысьпяшэньні росту і яе сацыялістычных форм. Вясеньняя кампанія паказала, што зусім неабгрунтаванымі былі думкі паасобных таварышоў, што нібы-та рад фінансава-эканамічных мерапрыёмстваў студзеня, лютага і сакавіка месяцаў надаравалі давер'е серадняка да савецкай улады: гэта пацьвярджаецца тым, што серадняк пашоў на павялічэньне пасеўнай плошчы як па хлебу, так і па льну, ня гледзячы на тое, што пры загатоўках ільну быў ужыты больш лік адміністрацыйных мер. Гэты дадатны клясавы вынік дасягнуты дзякуючы ўвазе партыі ў вясеньняй пасяўной кампаніі. Вясеньняя пасяўная кампанія павінна была даць больш станоўчыя эканамічныя і палітычныя вынікі. Аднак, пленум адзначае, што Наркамвем да асеньняй пасяўной кампаніі падрыхтаваўся менш здавальняюча, і што ўвага партарганізацый да асеньняй пасяўной кампаніі ў радзе выпадкаў была зусім невыстарчальнай; асабліва невыстарчальная ўвага была зьвернута на стварэньне шырокай грамадзкай зацікаўленасьці да гэтай кампаніі.

4. Будаўніцтва і ўзмацненьне калектыўных гаспадарак стала важнейшай практычнай задачай, на правядзеньне якой была за мінулы перыяд згуртавана ўвага партыі. Пленум ЦК КП(б)Б адзначае колькасна здавальняючае выкананьне неакрэсьленага вясною пляну арганізацыі калектыўных гаспадарак і ўказвае, што вясковая бедната і частка серадняковай падтрымала курс на калектыўныя гаспадаркі, бачачы ў іх найбольш шпаркі выхад з свайго становішча. Пленум побач з гэтым адзначае, што работнікі земорганаў ня ўсюды яшчэ ў выстарчальнай меры зразумелі і ў асобных выпадках ня досыць усьвядомілі лінію ХУ-га зьезду УсеКП(б). Пленум адзначае таксама, што агранамічныя сілы БССР не зразумелі яшчэ поўнасьцю, што Кастрычнікавая рэвалюцыя дала новы больш шпаркі тэмп узьнясьцьця сельскае гаспадаркі, і што гэты тэмп можа быць рэалізаваны толькі на падставе рашэньняў ХУ-га зьезду. Дзеля гэтага адзяй з задач КП(б)Б зьяўляецца выхаваньне і падрыхтоўка кадраў спэцыялістаў сельскае гаспадаркі, якія арыентуюцца на сацыялістычную буйную сельскую гаспадарку.

5. Затрудненьні ў забесьпячэньні сыравінай дзяржаўнай прамысловасьці (лён, скура, бульба, масланасеньне) прывялі да неабходнасьці ўжыцьця раду адміністрацыйных мерапрыёмстваў да спэкулянтаў гэтымі відамі сыравіны. Паколькі спэкулянцкія скурсырцом і масланасеньнем у БССР часта зьвязана з саматужнай апрацоўкай гэтых відаў сыравіны, адміністрацыйныя мерапрыёмствы ў паасобных выпадках закранулі і саматужнікаў—гарбароў і масларобаў. Пленум ЦК КП(б)Б зазначае, што зьнішчэньне саматужных прадпрыёмстваў не ўваходзіла ў мэты савецкае дзяржавы, з прычыны чаго ўсякія рэпрэсыўныя меры ў адносінах да саматужнікаў, не спэкулюючых сырцом (канфіскацыя сырцу, закрыцьцё прадпрыёмстваў), павінны быць зжыты. Адначасовасьць ужываньня гэтых адміністрацыйных мер з узмацненьнем фінансавага націску на прыватны гандаль і з узмоцненым разьвіцьцём дзяржаўнага і кааперацыйнага гандлю прывяла да таго, што значныя групы местачковага і гарадзкога дробна-буржуазнага насельніцтва апынуліся выкінутымі з працэсу вытворчасьці і звароту. Гэтыя абставіны стварылі трывожныя настроі сярод гэтых пластоў, ня маючых перспэктыў на будучае. Пленум ЦК КП(б)Б зазначае, што гэтыя пласты, наколькі яны жывуць з непрацоўнага прыбытку, ня маюць у савецкай дзяржаве будучыні і павінны арыентавацца на перадох да вытворчай працы (земляробства, прамысловасьць). Выходзячы з гэтага, пленум лічыць неабходным прысьпешаньне мерапрыёмстваў па гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак, узмацненьне працы па пераходу местачковай яўрэйскай беднаты на зямлю і ўцягненьне яе ў прамысловасьць, забясьпечыўшы выкананьне пляну гаспадарчага ўпарадкаваньня мястэчак неабходнымі крэдытамі. Пленум лічыць, што павінна быць узмоцнена праца на яўрэйскім земляўпарадкаваньні на неўпарадкаваных і нявыкарыстаных землях БССР, а таксама ў Біра-Біджанскім раёне, на поўдні Украіны і ў Крыме. Пленум адзначае, што клясавая барацьба сярод местачковага насельніцтва прыводзіць да таго, што групы дробнай буржуазеі, якія ня хочуць і нездольны перайсьці да вытворчае працы, вядуць барацьбу проціў яўрэйскай земляробскай калёнізацыі, асабліва ў Біра-Біджанскім раёне, з прычыны чаго проціў гэтых кірункаў, як клясава-варожых дыктатуры пралетарыяту, неабходна весьці кампанію па растлумачэньні ў масах.

Пленум ЦК КП(б)Б, лічачы, што важнейшай задачай у адносінах да саматужнікаў зьяўляецца іх вытворчае каапераваньне, са здаваленьнем адзначае, што значная частка саматужнікаў, якія, у зьвязку з узмацненьнем дзяржаўных загатовак сыравіны, ня мелі магчымасьці самі падрыхтаваць сыравіну, увайшлі ў арцелі саматужнай прамысловай кааперацыі, якія забясьпечваюцца сыравінай дзяржорганамі.

6. Пленум ЦК КП(б)Б канстатуе, што труднасьці вясеньня-летняга пэрыяду не прывялі да паслабленьня пазіцыі рабочае клясы і да парушэньня яе саюзу з сялянствам, а стварылі ўмовы для далейшага росту гегемоніі пралетарыяту і пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва, пры ўмовах настойлівай работы партыі па арганізацыі клясавае сьвядомасьці і палітычнае актыўнасьці пралетарыяту і вясковае беднаты пры ўмовах рашучае барацьбы з недахопамі прамысловага будаўніцтва, бюракратызмам і няўвагай да запатрабаваньняў мас, пры цьвёрдым і няўхільным правядзеньні лініі, вызначанай XУ зьездам.

II. Агулька-палітычныя задачы вясеньняга пэрыяду.

1. Пасьпяховае выкананьне эканамічных планаў савецкае дзяржавы зьяўляецца важнейшай палітычнай задачай вясеньня-зімняга пэрыяду. Канстатуючы, што ніводная з асноўных гаспадарчых труднасьцяў вясеньня-летняга пэрыяду ня была толькі труднасьцю сэзоннага характару, а карані іх ляжаць у адсталасьці эканомікі Савецкага Саюзу, пленум папярэджвае аб магчымасьці паўтарэньня некаторых гэтых затрудненьняў у вясеньня-зімні пэрыяд. Важнейшымі задачамі падыходзячага пэрыяду павінны быць; а) усямернае садзейнічаньне работе загатоўчых органаў, у першую чаргу па загатоўках хлеба, ільну, скуры; б) выкананьне экспартнага пляну; в) эканомнае выдаткаваньне хлеба і г) рэалізацыя фінансавых мерапрыёмстваў дзяржавы (своячасовы збор падаткаў, пазык, запазычанасьці, страховак і рэалізацыя поўнасьцю 2-й пазыкі індустрыялізацыі).

Выходзячы з таго, што распаўсюджваньне 2 пазыкі індустрыялізацыі да гэтага часу ідзе, галоўным чынам, у гарадох, указаць мясцовым арганізацыям на неабходнасьць большага распаўсюджваньня пазыкі на вёсцы.

Па посьпехах пры выкананьні гэтых мерапрыёмстваў партыя будзе меркаваць аб працаздольнасьці паасобных арганізацый.

2. Надыходзячыя перавыбары саветаў (студзень-люты) будуць праверкай працы нашае партыі і яе ўплыву ў масах. Завастрэньне клясавае барацьбы ў краіны вымагае, каб партыя заразжа прыступіла да палітычнай падрыхтоўкі перавыбарчай кампаніі ў саветы і да арганізацыі беднаты да перавыбараў. Неабходна навесьці шырокую справаздачу ўраду, выканкомаў, райвыканкомаў, сельсаветаў і гарсаветаў перад масамі выбаршчыкаў, арганізуючы выезды членаў ураду і выканкомаў на рабочыя і сялянскія сходы. Трэба разгарнуць шырокую крытыку працы ўсіх савецкіх органаў у рабочай і сялянскай масе, дабіцьця дзелавой ацэнкі дзейнасьці як арганізацыі, так і паасобных работнікаў. Неабходна зараз-жа прыступіць да складаньня сьпісаў выбаршчыкаў і тых, што ня маюць выбарчага права.

Выходзячы з таго, што нізавы савецкі апарат вымагае значных паляпшэньняў, асабліва ў прыгранічных раёнах, і чысткі ад разлажыўшыхся і кулацкіх элемэнтаў, прафарганізацыі павінны паклапаціцца аб іх выяўленьні і адводзе ў часе выбараў, аб высоўваньні новых работнікаў як з членаў партыі, так і з безпартыйных рабочых і сялян, правяраючы у працягу бліжэйшых месяцаў іх дзелавую і палітычную якасьць. Вынік выбарчай кампаніі павінен даць далейшае ўзмацненьне пазіцыі рабочае клясы, вясковай беднаты і сельска-гаспадарчых рабочых і забясьпечыць цьвёрдае і дзелавое кіраўніцтва масамі на бліжэйшы пэрыяд работы саветаў.

3. Перад прафарганізацыямі Пленум ЦК КП(б) ставіць задачу разгарнуць прафсаюзную дэмакратыю і рабочую самакрытыку, накіроўваючы самакрытыку на асноўныя пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва, разгортваючы ініцыятыву мас як па справе садзейнічаньня ўраду, так і па справе барацьбы за поўнае выкарыстаньне рабочымі масамі сваіх правоў. Асабліваю ўвагу зьвярнуць на ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы. У сувязі з надыходзячым пераазключэньнем калдагавораў, Пленум прапануе праверыць выкананьне існуючых дагавораў, асабліва ў галіне абслугоўваньня бытавых патрэб і аховы працы. Пленум прапануе забясьпечыць належным парадкам шырокае абгаварэньне на масавых сходах як прапануемых прафсаюзных праэктаў дагавораў, так і прапаноў дзяржорганаў і старанна заўважваць папраўкі і прапановы паасобных рабочых і груп рабочых. **Пленум прапануе выкарыстаць надыходзячыя зьезды раду прафсаюзаў для высоўваньня новых кадраў рабочых і работніц на кіруючую прафсаюзную і гаспадарчую работу.**

4. Адзначаючы буйныя дасягненьні ў галіне кааперараваньня насельніцтва і павялічэньня пазных узносаў, Пленум лічыць неабходным забясьпечыць далейшы рост спажывецкай кааперацыі і зьвярнуць асаблівую ўвагу на далейшае разьвіцьцё і палепшаньне работы сельска-гаспадарчай кааперацыі, асабліва на яе спэцыяльныя віды, забясьпечваючы яе кваліфікаванымі работнікамі. У надыходзячай перавыбарчай кампаніі Пленум прапануе даць рашучы адпор кулацкім элемэнтам і забясьпечыць узмацненьне пралетарскага ўплыву і ролі беднаты ў кіраўнічых кааперацыйных органах.

5. Прамысловае будаўніцтва, разгортваючыся, вымагае асаблівай увагі рабочых мас і партыі. Пленум прапануе бюро ЦК прыняць рашучыя меры а ўладжаньня сырцовага пытаньня і і забесьпячэньня нармальнага ходу вытворчае працы. Побач з гэтым Пленум зазначае на невыкананьне прамысловасьцю дырэктыў аб узьняцьці вытворчасьці працы, што павінна быць адхілена ў працягу асеньняга пэрыяду. Невыстарчальнасьць кваліфікаваных кадраў кіраўніцтва прамысловасьцю ставіць перад партыяй задачу перападрыхтоўкі іх як у спэцыяльных навучальных установах, так і на самай рабоце. Пленум прапануе ВСНГ забясьпечыць магчымасьць раду лепшых гаспадарнікаў у ходзе працы папаўняць свае веды, а для папаўненьня кадраў уліць у прамысловасьць рад прафэсыянальных, савецкіх і партыйных работнікаў, пераважна з рабочых. **Выходзячы з таго, што пасьпяховае кіраўніцтва прамысловасьцю магчыма толькі пры разгорнутай рабочай самакрытыцы і ініцыятыве мас, Пленум прапануе забясьпечыць шырокае абгаварэньне важнейшых буданічых і вытворчых пытаньняў на рабочых і партыйных сходах.**

6. Выходзячы з таго, што актыўнасьць і культурнасьць масы работніц і сялянак расьце паволі, што зьяўляецца сур'ёзнай перашкодай у справе сацыялістычнага будаўніцтва, Пленум ЦК зьвяртае ўвагу на тое, што будучыя перавыбары дэлегацкіх сходаў маюць буйнейшае значэньне і дзеля гэтага павінны быць праведзены як шырокая агульна-палітычная кампанія, з актыўным удзелам парткамітэтаў у цэлым. **Адзначаючы нездавальняючы стан высоўваньня жанчын на кіраўнічую працу, Пленум прапануе забясьпечыць высоўваньне раду кваліфікаваных камуністак у склад калегій наркаматаў, як загадчыкаў аддзеламі акрвыканкомаў, а таксама на кіраўнічую партыйную і прафсаюзную працу ў акругах і раёнах.**

7. Бяручы пад увагу буйнейшае значэньне разьвіцьця калгасаў, Пленум ЦК прапануе стварыць 5-цігадовы плян разьвіцьця калгасаў, з тым, каб ён быў абмяркован у арганізацыі, узмацніць земорганы работнікамі, якія могуць пасьпяхова праводзіць курс на калектывізацыю, забясьпечыць у С-Г. Акадэміі падрыхтоўку спэцыялістаў для абслугоўваньня буйных сацыялістычных гаспадарак (калгасаў і савгасаў) і абгаварыць магчымыя мерапрыёмствы для прысьпешаньня калектывізацыі сельскай гаспадаркі (канкрэтны перавод на кааперацыйны статут цэлых пасёлкаў, паасобных вёсак і г. д.).

8. Выходзячы з складанасьці задач, што стаяць перад партыяй, Пленум прапануе забясьпечыць высокі тэмп работы партыйных арганізацый.

9. Пленум адзначае, што на грунце разьвіцьця самакрытыкі выявіўся рад нездаровых зьявішч у паасобных выпадках дзяржаўнага апарату (разлажэньне паасобных работнікаў, скажэньне клясавай лініі) і прапануе партарганізацыям узмацніць разуменьне адказнасьці з боку савецкіх ячэек, асабліва на вёсцы, за работу апарату, кіруючыя ў практычнай працы пастановамі ЦК аб працы савецкіх ячэек у барацьбе з бюракратызмам і за паляпшэньне савецкага апарату.

Побач з гэтым разгарнуць барацьбу з растратамі ў кааперацыйным апараце, якія выяўляюць тэндэнцыю да росту, завастрэўшы ўвагу ячэек, кааперацыйнага актыву і ўсёй грамадзкасьці навакол гэтага пытаньня.

III. Самакрытыка. Партыйна-арганізацыйныя задачы.

1. Пленум ЦК зазначае, што самакрытыка ў радзе арганізацый КП(б)Б яшчэ невыстарчальна разгарнулася, і што рад партыйных работнікаў яшчэ не зразумелі сэнсу і значэньня яе. Аднак, самакрытыка ўжо дала значныя вынікі ў справе паляпшэньня работы як на прадпрыёмствах, так і ў савецкіх і прафсаюзных органах і дапамагла зьнішчыць рад буйных недахопаў у гаспадарчым, савецкім і прафсаюзным апараце. Самакрытыка дапамагла выкрыцьцю злоўжываньняў, нядбайных адносін да патрэб рабочых, зьнішчэньню бюракратызму і адхіленьню з апарату расклашуюся і клясава-варожых пралетарыяту элемэнтаў. **Пленум падкрэсьлівае вялікае значэньне і ролю друку ў справе арганізацыі самакрытыкі. Разам з тым Пленум адзначае ўсё яшчэ невыстарчальную ўвагу акруговых і раённых камітэтаў да газэтных матар'ялаў аб маючых месца злоўжываньнях, бюракратызьме і фактах распаду і спробы (якія ўсё яшчэ маюцца) захаваньня выкрытых недахопаў, з чым трэба павесьці рашучую і бязьлітасную барацьбу. Пленум ЦК прапануе АК яшчэ больш дасканала сачыць за рабкораўскім матар'ялам, што друкуецца, выкрываючы ўсе факты да канца. Разам з тым, Пленум зазначае на тое, што ня ўсё факты, якія вызначаюцца рабочымі на прадпрыёмствах, фіскуюцца, і не заўсёды рабочыя атрымліваюць на іх здавальняючы адказ. Пленум, акрамя таго, зазначае на наяўнасьць раду выпадкаў зусім нясур'ёзных адносін да пастаноў, што выносяцца на рабочых сходах.**

2. Надыходзячыя перавыбары бюро ячэек і райкомаў павінны прайсьці пад знакам шырокай унутрыпартыйнай дэмакратыі і самакрытыкі. Павінна быць забясьпечана выбарчасьць усіх парторганаў зьнізу да верху і шырокае дзелавое абгаварэньне дакладаў. Павінны быць бязумоўна зьняты з кіруючай работы працаўнікі з бюракратычнымі нахіламі, якія раскладаліся і якія не зразумелі бягучых задач партыі, якія ня ўмеюць і нездольны праводзіць курс на самакрытыку і ўнутрыпартыйную дэмакратыю. Разам з тым Пленум зазначае на абсалютную недапушчальнасьць абвінавачаньня ў раскладаньні цэлых партарганізацый, што мела месца ў некаторых газэтных артыкулах і што зьяўляецца бязумоўна несапраўдным і шкодным.

3. Самакрытыка, што разгортвалася, патрабавала прысутнасьці на мясцох раду членаў бюро ЦК і стварэньня спэцыяльных камісій ЦК і ЦКК для высьвятленьня выкрытых недахопаў (Віцебск, Полацак, Мазыр). Пленум ЦК ухваляе практыку выездаў членаў ЦК і ЦКК на месцы для дапамогі мясцовым партарганізацыям у палепшаньні работы і адхіленьні выкрытых недахопаў. Пленум таксама ўхваляе пастановы бюро ЦК у адносінах да Віцебскай і Полацкай арганізацый.

4. Выходзячы з таго, што значнымі прычынамі раскладаньня асобных работнікаў зьяўляецца п'янства, распушчанасьць і сямейнасьць, змычка з дробна-буржуазнымі элемэнтамі ў быце, Пленум ЦК прапануе ўжыць больш рашучыя меры барацьбы супроць гэтых нездаровых зьяў. Разам з тым, Пленум ЦК лічыць неабходным разгарнуць барацьбу з алкагалізмам і заахвочваць прапанову рабочых аб закрыцьці піўных і продажу віна і гарэлкі ў рабочых раёнах, імкнучыся да паступовага скарачэньня спажываньня сьпірытусовых напіткаў.

5. Узрост актыўнасьці рабочае клясы і вясковай беднаты і батрацтва дае магчымасьць шырэй паставіць пытаньне аб вярбоўцы новых членаў у партыю з рабочых, батракоў і вясковай беднаты з тым, каб да студзеня 1930 году ў КП(б)Б было прынята ня менш 9000 новых членаў, і каб процант рабочых ад варштату ў КПБ быў бы даведзен да 45. Бюро ЦК даць акругкомам падрабязныя ўказаньні.

6. Узрост варожасьці да партыі і савецкай улады з боку кулацтва, узмацненьне яго актыўнасьці і клясавая барацьба ў вёсцы, якая ўсё абвастраецца, патрабуюць выключна сур'ёзнай увагі да работы з беднатой і ўзмацненьня бядняцка-серадняцкага блёку.

Пленум адзначае паслабленьне работы з беднатой за летні пэрыяд і абавязвае ўсе акруговыя партарганізацыі зараз-жа прыступіць да разгортваньня і паглыбленьня работы з беднатой, праводзячы гэтую работу з дня ў дзень сыстэматычна. **Пленум асабліва падкрэсьлівае неабходнасьць замены груп беднаты ў стала працуючыя актыўныя арганізацыі, жыва рэагуючыя на ўсе зьявы вясковага жыцьця.** Пленум лічыць, што вопыт райённых і акруговых нарад груп беднаты сябе апраўдаў, і прапануе правесьці такія нарады ў асеньня-зімовы пэрыяд у зьвязку з бліжэйшымі задачамі работы ў вёсцы.

Пленум лічыць працу сярод батрацтва, якая праводзілася да гэтага часу, невыстарчальнай і прапануе мясцовым арганізацыям ужыць неабходныя меры да яе ўзмацненьня.

7. Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на работу ячэйкавага актыву—нізавых зьвяньняў у ланцугу парт'органаў—цэхячэйкі, цэхоргаў, групоргаў, індывідуалаў, апоргаў і жаноргаў, а таксама на ўпарадкаваньне кіраўніцтва імі з боку парткомаў. У асеньнім пэрыядзе работы партыі, калі надыходзяць перавыбары зьверху да нізу прафэсыянальных, савецкіх і іншых органаў, абраньне сапраўды працаздольных органаў залежыць ад сувязі з масамі, а апошняя ад пастаноўку масавай работы. А таму неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкананьне рэзалюцыі пленуму ЦК КП(б)Б, які адбыўся ў сакавіку 1927 году, аб масавай працы, больш часта праводзіць самаправерку, паставіць яе больш плянава.

8. Асноўнай задачай камфракцый у непартыйных выбарчых органах зьяўляецца ўзмацненьне партуплыву ў рабочых масах, арганізаваных у адпаведныя арганізацыі і ўцягненьне лепшых грамадзкіх працаўнікоў, рабочых і сялян—у штодзённую практычную працу па будаўніцтве сацыялізму. Выкананьне гэтай асноўнай задачы камфракцый у сваю чаргу залежыць ад пастаноўкі работы фракцый, у прыватнасьці, ад правільнага і своечасовага ажыцьцяўленьня партыйных дырэктыў, ад разьвіцьця самадзейнасьці, ініцыятывы і адказнасьці ў рабоце.

Ненармальнасьці, што маюцца ў працы камфракцый павінны быць зжыты,—бяз гэтага немагчымы арганізаваны ўплыў нашай партыі на масавыя арганізацыі рабочае клясы.

Пленум ЦК КП(б)Б асабліва падкрэсьлівае ўвагу ўсіх партыйных і прафэсыянальных арганізацый **на разьвіцьцё шэфскай работы рабочай клясы над вёскай,** якая ў апошнія часы ў цэлым радзе выпадкаў зусім паслабла, чаму неабходна прыняць самыя рашучыя меры да ажыўленьня работы шэфскіх арганізацый.

9. У галіне становішча партапарату Пленум ЦК КП(б)Б прызнае неабходным весьці няўхільна лінію на скарачэньні апарату і рацыяналізацыі партыйнай работы. Дзеля гэтага Пленум ЦК прапануе партарганізацыям, асабліва ў гарадох, шырока практыкаваць абслугоўваньне партыйных мас, як політпроп, так і арганізацыйнай работай, на падставах дабраахвотнай грамадзкай працы. Пленум лічыць, што значная частка работы ў гарадзкіх райкомах ужо ў гэтым годзе можа быць пераведзена на пачатках дабраахвотнай працы членаў партыі. Разам з тым Пленум ЦК надае буйнейшае значэньне ролі сэкратароў і іншых кіруючых работнікаў на буйных прамысловых прадпрыёмствах. Неабходна поўнасьцю ажыць адносіны да кіруючай работы ў ячэйцы, як вузкай, малаважнай і г. д. Дзеля гэтага неабходна павялічыць зарплату сэкратаром вытворчых ячэек да ўзроўню зарплаты найбольш кваліфікаваных груп рабочых давага прадпрыёмства. Пленум прапануе бюро ЦК ужыць усе меры для прадастаўленьня магчымасьці сэкратарам райкомаў і ячэек, у першую чаргу, сыстэматычна папаўняць свае веды, разгружаючы іх ад тэхнічнай работы і прадастаўляючы спэцыяльныя водпускі на вучобу і чытаньне.

10. Адзначаючы значныя посьпехі ў справе беларусізацыі партыйнага, савецкага і прафсаюзнага апарату. Пленум ЦК аднак зазначае, што дырэктывы аб вывучэньні ўсім актывам беларускае мовы яшчэ ня выкананы, што рад галін культурнай, грамадзкай і дзяржаўнай работы яшчэ ня досыць беларусізаваны. Неабходна дамагчыся на працягу асеньняга пэрыяду **поўнага пераводу савецкай, партыйнай і прафэсыянальнай работы, якая абслугоўвае беларускія масы, на беларускую мову узмацніць беларусізацыю ВНУ** і лепш паставіць распаўсюджаньне беларускай літаратуры. Бюро ЦК неабходна стварыць спрыяючыя ўмовы для паскораньня беларусізацыі і разьвіцьця беларускай культуры.

Адставаньне ў разьвіцьці яўрэйскай культуры, якое наглядаецца, узьнімае актыўнасьць варожых нам элемэнтаў у яўрэйскім асяродку і стварае цяжкія настроі сярод часткі працоўных яўрэйскіх мас.

Пленум зьвяртае ўвагу партыйных і савецкіх органаў не неабходнасьць узмацненьня і палепшаньня працы яўрэйскіх культурных установаў, на іх далейшае разьвіцьцё і папулярызацыю і тым самым узьняць вагу і значэньне яўрэйскай культуры ў вачох шырокіх яўрэйскіх мас і ў агульным культурным будаўніцтве.

IV. Палітычнае выхаваньне-партыі. Падрыхтоўка кадраў

1. Палітычнае выхаваньне і падняцьце культурнага ўзроўню членаў партыі, ва ўмовах клясавай барацьбы, якая абвастраецца, набывае ў нас буйнейшае значэньне. Пераходзячы да поўнай добраахвотнасьці пры арганізацыі партыйных школ, Пленум ЦК лічыць неабходным зьвярнуць увагу партарганізацый на неабходнасьць прадастаўленьня магчымасьці членам партыі ў ходзе іх работы атрымаць тэарэтычную асьвету шляхам чытаньня кніг, скарыстоўваючы завочныя унівэрсытэты, наведваньне лекцый, абгаварэньне важнейшых палітычных і тэарэтычных пытаньняў на партыйных сходах (пытаньні клясавае барацьбы, міжнароднага рэвалюцыйнага руху, праграма Камінтэрну і г. д.). Мэтай палітычнага выхаваньня павінна быць выхаваньне клясавай сьвядомасьці і актыўнасьці, міжнароднай салідарнасьці і зразуменьня задач партыі і пралетарыяту. Разам з тым Пленум лічыць неабходным падтрымаць імкненьне членаў партыі, асабліва рабочых, да атрыманьня агульна-асьветных і тэхнічных ведаў шляхам самаадукацыі, скарыстаньня завочных курсаў, спэцыяльных рабочых навучальных установаў (курсаў, тэхнікумаў і г. д.), лічачы гэта іх асноўнай партнагрузкай і вызваляючы іх ад іншых партабавязкаў.

2. Палітычнае выхаваньне членаў нашай партыі і рабочае клясы грунтуецца на вывучэньні ленінізму і марксызму. Таму **распаўсюджаньне ў шырокіх масах членаў партыі і сярод рабочых твораў Леніна, Маркса і Энгельса мае буйнейшае партыйна-выхаваўчае і культурнае значэньне.** Пленум адзначае **буйнейшае значэньне выданьня твораў У. І. Леніна на беларускай мове** і прапануе бюро ЦК КП(б)Б забясьпечыць гэта выданьне кваліфікаванымі работнікамі і неабходнымі матар'яльнымі сродкамі, а таксама забясьпечыць шырокае яго распаўсюджаньне. Пленум разам з тым лічыць, што гэта выданьне выбраных твораў У. І. Леніна зьяўляецца падрыхтоўчым да выданьня поўнага збору твораў У. І. Леніна.

Пленум лічыць неабходным прыступіць да выданьня паасобных твораў К. Маркса і Фр. Энгельса на беларускай мове.

3. Пленум ЦК цалкам ухваляе лінію бюро ЦК на падрыхтоўку і перападрыхтоўку партыйных кадраў КП(б)Б у вышэйшых партыйных і спэцыяльных навучальных установах. Выходзячы з гэтага, пленум прызнае зусім правільным адкамандыраваньне значнай групы партыйных работнікаў для вучобы на курсах марксызму пры Кам. Акадэміі і Інстытуту Чырвонай Прафэсуры, Прамысловую Акадэмію, ВТНУ і Камвузы і г. д. Разам з тым, Пленум прапануе бюро ЦК ужыць меры да наладжаньня сталай сувязі камандыраваных на вучобу з Беларусі, распрацоўку імі ў ходзе навучальнай работы праблем, зьвязаных з жыцьцём, будаўніцтвам і культурай Беларусі. Пленум лічыць таксама неабходным забясьпечыць зварот іх пасьля скančэньня вучобы для працы ў шэрагах КП(б

Тав. Стасевіч—новы загадчык АПА ЦК КП(б)Б

Тав. Стасевіч, абраны загадчыкам АПА ЦК КП(б)Б, паходзіць з сялян Горадзенскай губэрні. Скончыў настаўніцкую сэмінарыю. У кампартыю ўступіў у 1918 годзе.

З 1921 году працуе ў БССР на адказных савецкіх і партыйных пасадах: Намесьнікам Народнага Камісара Унутраных Спраў БССР, загадчыкам Аргаддзелам Слуцкага Укому і сакратаром Менскага Укому. Да апошняга часу—сакратаром Аршанскага Акругкому; член ЦК КП(б)Б і ЦВК.

Тав. Стасевіч мае стаж падпольнай работы як у часе акупацыі Адэсы ў 1919 годзе, так і на Беларусі—пры паляках.

ПАПРАЎКА.

У № 211 «С. Б.» на 3 стар. у „Інфармацыйным паведамленьні" аб закьверджаньні пленумам ЦК КП(б)Б зьмен у складзе членаў бюро ЦК памылкова надрукавана (2-гі абзац): «Абавязкі загадчыка АПА ЦК КП(б)Б ускладзены на т. СТАШЭЎСКАГА», а трэба: „АБАВЯЗКІ ЗАГАДЧЫКА АПА ЦК КП(б)Б УСКЛАДЗЕНЫ НА ТАВ. СТАСЕВІЧА".

ЯК ПРАХОДЗІЦЬ СЯЎБА АЗІМІНЫ

(Гутарка з Народным Камісарам Земляробства т. Прышчэпавым).

Зараз па БССР распачалася масавая сяўба азіміны. У некаторых райёнах напалову ўжо адсеяліся. З тае прычыны, што ў апошні месяц сканцэнтраваліся ўсе работы ў сельскай гаспадарцы, як сяўба, жніво, малацьба, касьба,—сяўба азіміны расьцягнулася на цэлы месяц. Трэба меркаваць, што ў бліжэйшыя 10-12 дзён масавая сяўба будзе закончана.

Што-ж датычыцца забесьпячэньня насеньнем, то ўсе акругі больш менш забясьпечаны здавальняюча; усе заўкі іх задаволены з перавышэньнем, за выключэньнем Віцебскай, Аршанскай і Полацкай округ, якія толькі ў апошнія часы павялічылі свае заўкі ў 2-3 разы. Такое зьявішча з боку гэтых округ трэба лічыць ненармальным. Гэтым акругам пастаноўлена павялічыць адгрузку насеннага жыта, супроць першапачатковай заявы, па 10 тысяч пудоў кожнай за кошт харчовых запасаў савгасаў Белсельтрэсту. *Што-ж датычыцца насеньня Украіны, то ўжо па ўсіх округах праходзіць адгрузка яго. З савгасаў Белсельтрэсту да 7 верасьня было адгружана 18900 пудоў жыта, а да 13 верасьня павінна быць адгружана рэшта 20000 пуд.*

Наогул-жа, усе округі забясьпечаны насенным жытам як завозным, так і сваім ў наступным разьмеры: Полацкая округа—65000 пуд., Віцебская—42000 пуд., Аршанская—38400 пуд., Гомельская—17400 пуд., Бабруйская—27000 пуд., Менская—47000 пуд. (апроч гэтага, з прычыны градабіцьця, Лагойскаму раёну пастаноўлена выдаць з фонду абмену 800 пуд.), Магілёўская—10600 пуд. і Мазырская—5000 п.

У галіне забесьпячэньня мінэральным угнаеньнем мы маем на ступнае: ужо адгружана 7100 тон суперфасфату і чакаем яшчэ адгрузкі 1700 тон *замест недагружанай фасфарытай мукі. Такім чынам,* увесь фонд мінэральных угнаеньняў на восень складаецца з 8800 тон.

Кантрактацыя азіміны да пачатку верасьня праходзіла нездавальняюча. *На 1-га верасьня было ўсяго выканана 38 проц. плану. Асабліва слаба праходзіць кантрактацыя азіміны ў Бабруйскай акрузе, больш здавальняюча—у Гомельскай. У свой час мы даручылі зямельным і каапэрацыйным установам больш актыўна праводзіць кантрактацыю, з тым, каб заданьне выканаць на ўсе 100 проц.*

У галіне гаспадарчага абслугоўваньня калгасаў, асабліва ў нова арганізаваных, праца сёлета разгарнулася недастаткова. Вельмі неабходна, каб у друку было распачата абгаварэньне, як праходзіць калгаснае будаўніцтва ў БССР, і тых перашкодах, якія сустракаюцца ў гэтай працы. Для абгаварэньня ўсіх пытаньняў, зьвязаных з калгасным будаўніцтвам, трэба прыцягнуць да гэтай справы тых працаўнікоў зямельных органаў і калгасаў, якія займаліся гэтым пытаньнем.

Вялікае значэньне надаецца сёлета закладцы групавых садоў. *На гэту справу сёлета было адпушчана* 60.000 руб. крэдыту.

У сёлетнюю восень мае быць засаджана 1200 — 1300 гэктараў групавых садоў *у розных округах БССР. У сучасны момант на мясцох праводзіцца падрыхтоўчая праца.* Нашы гадавальнікі змогуць выпусьціць 250.000 штук розных садовых шчэпаў. *У зьвязку з заявамі з месц аб недахопе крэдытаў на закладку групавых садоў, Белсельбанку было даручана абмеркаваць магчымасьць пашырэньня крэдыту на гэту справу.*

Не парушаючы пляну закладкі групавых садоў, сёлета ў пасёлках мы лічым мэтазгодным у далейшым праводзіць гэта мерапрыёмства гнездавым парадкам, прыстасоўваючы закладку групавых садоў да эканамічных цэнтраў (мястэчак, чыгуначных станцый і інш).

Вялікую ўвагу трэба зараз зьвярнуць на зернаачышчэньне. На пляну сёлета мяркуецца ачысьціць 7 проц. усяго насеннага матар'ялу. Часу засталося вельмі мала. Вось чаму на гэты вучастак на мясцох трэба зьвярнуць вялікую ўвагу.

„Пералётныя птушкі" яшчэ ў выраі.

(Самахвалавіцкі р.).

Новы навучальны год ужо набліжаецца. З 15 верасьня вясковыя школы павінны пачаць заняткі. Бацькі затрым ліваюць дзяцей школьнага ўзросту дома, пакуль ня скончацца палявыя работы, ня гледзячы па растлумачальную працу асьветнікаў. Дзеці, прышоўшыя пазьней, не пасьпяваюць з тымі вучнямі, якія пачалі нармальна вучыцца.

У Крупіцкім сельсавеце амаль-што ва ўсіх школах уведзена абавязковае навучаньне. Настаўніцтву неабходна своечасова падрыхтавацца к пачатку навучальнага году.

Між іншым большая частка настаўніцтва сельсавету не зьявілася ў школы, ня гледзячы на тое, што водпускі былі дадзены да 20-га жніўня, а некаторым да 10-га.

Настаўніца Крупіцкай школы паехала таксама да бацькоў і, скарыстаўшы водпуск, не зьявілася дапамагчы настаўніку закончыць рамонт, гэтак жа сама настаўніцы Закружанскай з Каралінскай школ.

Больш сумленная частка настаўніцтва ў штодзённай працы імкнуцца падняць працу ў школе, аўтарытэт сярод селянства, а «пералётныя птушкі» зьяўляюцца ў школы ў дзень заняткаў, а то і са спазьненьнем.

Райінспэктарыяту Нарасьветы трэба прыняць больш рашучыя меры да настаўнікаў, якія не зьяўляюцца своечасова на працу.

Райённы.

Праверка—самакрытыка—кантроль мас.

Бессаромнае звальненьне працаўнікоў.

(Ворша).

У лютым гэтага году загадчык магазыну ЦРК № 2—Ялейнік Г. М., быў арыштаваны быццам за тое, што няправільна складаў акты на бітае начыньне, прадаў прыватніку два мяшкі мукі ў розны час і за несвоечасовае складаньне акту на павышэньне цэн на муку. Такое абвінавачаньне супроць Ялейніка зьявілася ў выніку таго, што з боку некаторых прыказчыкаў магазыну № 2, увесь час былі спробы так ці інакш дыскрэдытаваць Ялейніка, назначанага праўленьнем у магазын № 2 для падняцьця дысцыпліны сярод працаўнікоў магазыну. Але ў той-жа час, калі трэба было дапамагчы Ялейніку, праўленьне нічога не зрабіла. Для Ялейніка-ж падняцьце дысцыпліны скончылася тым, што ён, дзякуючы працаўніком прылаўка, папаў у папраўчы дом. Паўтара месяцы прасядзеў Ялейнік у папраўчым доме, у які час справа яго была перададзена ў пракуратуру, адтуль сьледчаму і нарэшце ў Акруговы Суд. Ялейнік быў з папраўчага дому выпушчаны. Пакуль ён знаходзіўся ў папраўчым доме, праўленьне ЦРК Ялейніка не звальняла. Ён увесь час лічыўся на працы ў ЦРК. Яму нават выдавалі грошы ў пэнсіі ў той час, калі ён быў у папраўчым доме—5 сакавіка і ў дзень яго вызваленьня з папраўчага дому—28 сакавіка. І як-жа было звольніць Ялейніка з працы, калі ён працаваў у ЦРК дзесяць гадоў, увесь час на адказнай працы, нічога за ім ня было заўважана, ніколі ён не атрымліваў выгавара, ніколі ні капейкі не растраціў і лічыўся ў праўленьні ЦРК добрым працаўніком. І калі нарэшце Ялейнік вышаў з папраўчага дому і прышоў у праўленьне прасіць, каб хутчэй яго паслалі на працу (2-га красавіка г.г.), —яму адказалі, што заўтра гэтае пытаньне будзе вырашана. Але гэтыя «заўтра» цягнуліся бяз канца. Пададзеныя Ялейнікам заявы ў пісьмовай форме, ляжалі бяз усякага руху і без адказу ў папках для дакладу. Нарэшце 4 мая Акруговы Суд спыніў справу па абвінавачаньні Ялейніка. Здавалася-б, што ўжо дапусьціць Ялейніка да працы можна, падстаў для яго звальненьня няма ніякіх. Але справа з пасылкаю яго на працу цягнецца да 21 мая г. г. Калі Ялейнік падаў заяву ў РКК, там яна таксама ляжала да 21 чэрвеня, г. зн. цэлы месяц, толькі таму, што адміністрацыя ўвесь час ухілялася ад удзелу ў пасяджэньні РКК. Нарэшце мясцком саюзу афіцыйна запытвае праўленьне ЦРК, чаму Ялейніку не даюць працы, і настойліва прапануе адміністрацыі зьявіцца на пасяджэньне РКК. Прадстаўнік адміністрацыі зьявіўся толькі 21 чэрвеня і пасяджэньне адбылося. На гэтым пасяджэньні да згоды ня прышлі.

На другі дзень пасьля пасяджэньня РКК, Ялейніку далі выпіс з пратаколу пасяджэньня праўленьня ЦРК ад 14-га лютага г. г., у якім адзначалася, што Ялейніка звольніць з працы па тых-жа матывах, якія адзначаліся і РКК. Гэты выпіс з пратаколу ўручылі Ялейніку толькі 22 чэрвеня. А яна была, быццам, напісана 14-га лютага, г. зн. чатыры з паловаю месяцы назад.

29 чэрвеня справа была накіравана ў прымірыцельную камеру. Там Праўленьне ЦРК заяўляе, што Ялейнік звольнен з працы не Праўленьнем, а сьледчымі органамі. У той-жа дзень справа была перададзена трацейскаму суду. Саюз патрабуе дапусьціць Ялейніка на працу і заплаціць за ўвесь час прагулу. Праўленьне згаджаецца заплаціць толькі за два месяцы. Зараз справа знаходзіцца ўжо ў Працэсіі нарсуду г. Воршы. Чым яна скончыцца, невядома. Ялейнік знаходзіцца бяз працы ўжо 6 месяцаў.

Другі выпадак са звальненьнем былога загадчыка рабочай сталоўкі на Асінстроі—Януса. Бюро нагляду прызнала звальненьне Януса няправільным. Справа таксама ў судзе. І водлуг закону, суд павінен будзе Януса і Ялейніка зноў паставіць на працу. А праўленьню Аршанскага ЦРК прыдзецца заплаціць значную суму грошай Ялейніку і Янусу за прагул.

Зоркі.

Трэба аздаравіць арцель.

Сельска-гаспадарчая арцель «Серп і Молат», якая ўжо існуе чатыры гады, знаходзіцца ў Барбароўскім сельсавеце, Нараўлянскага раёну, на былых абшарніцкіх землях.

Арцель выглядае дрэнна: напалову разваленыя будынкі, запушчаны сад, слабая агародка гаспадаркі і неахайнасьць у памяшканьнях сяброў калектыву. Усё гэта сьведчыць аб тым, што культура яшчэ адсутнічае ў жыцьці калектыву, і што на гэты бок быту і жыцьця не зьвяртаюць увагі тыя, хто наведвае калгас з мэтай досьледу, з мэтай узьнящэй культурнага ўзроўню і выкананьня дырэктыў XV зьезду УсеКП(б).

Вакольнае насельніцтва глядзіць на калгас толькі з надворнага боку і, нажаль, з надворнага выгляду ацэньвае і вынагды сацыялістычнага будаўніцтва.

У калгасе маюцца арганізацыйны і вытворчы пляны, але калгасьнікі ня зусім добра разумеюць іх, ды, як відаць, не стараюцца і зразумець і выконваць іх, а большасьць думаюць і гавораць: «абыйдземся і бяз іх, абы хлеб».

Усё гэта зьяўляецца прычынай таго, што ўраджаі ў калгасе пакуль мала перавышаюць ураджаі селянскіх гаспадарак, а некаторыя культуры, як авёс і бульба—асноўныя, нават ніжэй.

Блізка ад калгасу знаходзіцца рака Прыпяць, за 20 вёрст—горад Мазыр; адным словам, калгас мае ўсе магчымасьці стаць прыкладам сацыялістычнага будаўніцтва, быць асяродкам агракультуры.

Але, нажаль, гэта ня так.

Члены калгасу працуюць бяз энэргіі, без жаданьня паказаць сваю працу.

На прыкладзе гэтага калгасу відаць, што мы робім вялікую памылку не ўмацняючы старых калгасаў, а стараемся біць «рэкорды» у колькасьці па арганізацыі новых, б'ём на колькасьць і ня цікавімся якасьцю.

„Лепш менш да лепшай"—лёзунг тав. Леніна, які мы забываем. Па арганізацыю новых мы кладзем усе сілы, а старыя застаюцца бяз увагі.

Неабходна ўсе культурныя сілы кінуць на ажыўленьне працы ў старых калгасах, палепшыць іх, зрабіць іх паказальнымі.

Выпадковы.

Таварышы, Акрздраву, вас гэта ня турбуе?

Па Інтэрнацыянальнай вул. № 31 (на другім дварэ) такая «чыстата», што нават у пакоі нельга сядзець. Здаецца і вокны шчыльна зачынены, а ўсё-такі ад памыйнай ямы чуваць такі смурод, што хоць дэзынфэкцыю рабі. Яшчэ ў чэрвені м-цы колькі разоў гаварылі б. загадчыку дамоў каб часьцей выграбаць памыйную яму, і кожны раз можна было пачуць, „будзе вроблена". Званілі ў Акрздраў санітарнай камісіі, там таксама сказалі, «прышлём санітарную камісію», але чамусьці камісія і да гэтага часу ніяк ня можа дайсьці. Цяпер, калі Камгас перадаў гэты дом 18-й 7-мігоддцы, стала яшчэ лепш. Дворніка вусім няма, жыхаром самім прыходзіцца падмятаць двор.

Калі адчыніш вакно, дык мала таго, што смурод, а то яшчэ і мухі з памыйнай ямы не даюць супакою (а кожнаму вядома, якія мухі бываюць у такіх мясцох).

Гэта ня толькі па Інтэрнацыянальнай вул., але і ў іншых мясцох наглядаюцца такія зьявішчы.

Пятрусь.

Дзе РВК, дзе аграномы?

(Уваравіцкі райён, Гомельшчына).

У пачатку студзеня 1926 г. у пасёлак «Цемны-Осаў», Лапіцкага сельсавету, неяк заехаў аграном. Селяне спачатку савецкай улады амаль што першы раз убачылі агранома і ўсе, як адзін, і стары і моладзь, нават і жанчыны, пашлі на сходку. Аграном быў засыпан рознымі пытаньнямі; дужа цікавіліся селяне пытаньнямі паляпшэньня сельскай гаспадаркі. Па сканчэньні пытаньняў аграном выцягнуў з кішэні аркуш паперы і аловак і запісаў селян, маючых патрэбу ў розных культурах насеньня капюшыны, і карняплоду для вясеньняй сяўбы. Селяне прасілі агранома вясной разьбіць пахаць на чатыры-пяць палёў; аграном паабяцаў, але з вясны 1926 г. прайшло яшчэ дзьве вясны, а агранома ня чуваць, насеньня таксама не адпусьцілі.

У гэтым годзе селяне два разы пасылалі падводу за райённым агрономам, які жыве ў в. Пыцькаўка, каб прыехаў і сумесна з сельсаветам агледзіў вымачкі, але-ж „шаноўны" аграном адзін раз ня быў знойдзен, а ў другі раз зусім адмовіўся ехаць. Прасілі, каб прыехаў і разьбіў пахаць на чатыры палі; ен таксама ня едзе.

У сучасны момант селяне калектыўна скаслілі грамадзкую сенажаць і прадалі сена за 37 руб., на якія сродкі арганізуюць машыннае таварыства. Каб гэтаму самацёку калектывізацыі даць правільны напрамак, надта патрэбна дапамога з боку РВК і агранома. Але да гэтага часу на пасёлку з боку агранома нічога ня робіцца. Сорамна перад селянствам за такую працу мясцовай улады.

Л.

ХТО ТАКІ „НАЧАЛЬНІК" ПОШТЫ У ДРЭТУНІ?

Загадчыкам Дрэтуньскай пошты (Полаччына) састаіць нейкі Александрыйскі, чалавек з шырокімі замахамі і вялікай думкай аб сваей асобе.

Справа ў яго так пастаўлена, што ня трэба дрэнней.

Напрыклад, лісты, выпадкова засланыя ў Дрэтунь з адрасам... Масква, доўга ляжыць на вачох Александрыйскага ў яго аддзяленьні.

Вайсковыя часткі таксама кепска абслугоўваліся, шмат было скарг і непаразуменьняў. Але гэта яшчэ нічога. Ёсьць справы па яскравей.

Напрыклад, пратэкцыянізм. Гэтым Александрыйскі не займаецца, ён прыняў толькі трох Баранавых, адзін пляменьнік, другі—дзядзька, а трэці—звычайна свой.

А калі яны яму свае, дык разам жывуць, ядуць і п'юць, разам прапаўшую ў лесе карову Александрыйскага шукаюць, свіней кормяць, ваду носяць і г. д. Усё гэта за лік... працоўнага часу.

Калі аб гэтым пачалі гаварыць іншыя працаўнікі, дык Александрыйскі ціха намякнуў ім пра біржу працы.

А калі праведаў аб гэтым саюз, дык Александрыйскі заявіў:—Я ня лічу патрэбным быць сябрам саюзу. А працаўнікоў біру тых, якіх хачу. Працаўнікі баяліся Александрыйскага і аб крытыцы і самакрытыцы ніхто і думаць ня сьмеў.

Цікава Александрыйскі „испытывал" сумленнасьць сваіх падначаленых. Бярэ таемна пасылку ці каштоўны ліст, хавае яго ў сябе, а потым, калі працаўнік са сляпьмі на вачох заявіць яму аб згубе Александрыйскі ўхваляе:—маладзец, ты сумленны хлапец. І аддае згубу.

Гэта толькі частка фактаў, іх ёсьць значна больш.

С.

Члены ЦВК БССР на Асінстроі.

(Па тэлефону ад уласнага карэспандэнта).

ВОРША, 13-9. Учора ўвечары праз Воршу на экскурсію на Асінстрой праехала 30 сяброў ЦВК БССР. Рабочыя Воршы ў колькасьці каля 10 тысяч чалавек вышлі сустракаць гасьцей. На вакзале адбыўся лятучы мітынг. Выступалі сябры ЦВК т. т. Баліцкі, Вінькевіч, Амбражунас, народны паэта Якуб Колас. Ад Варшанскай арганізацыі выступілі т. т. Калінін, Карачун, Вільтоў і Варончанка. Выступаўшыя сябры ЦВК паведамілі, што на Асінстрой яны едуць з мэтай дасканальнага агляду вялікага будаўніцтва, пасьля чаго будзе дан падрабязны даклад аб ходзе будаўніцтва на 3-й Сэсіі ЦВК БССР.

Сёньня днём на Асінстроі адбыўся грандыёзны мітынг рабочых і служачых будаўніцтва. З прамовай выступалі тт. Чарвякоў, Баліцкі, Якуб Колас і іншыя.

Зьнішчым бяспрытульнасьць.

БАРАЦЬБА З БЯСПРЫТУЛЬНАСЬЦЮ У МЕНСКУ.

ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ЗЬНІШЧЭНЬНІ БЯСПРЫТУЛЬНАСЬЦІ.

У працягу месячніка па барацьбе з бяспрытульнасьцю ў Менску праведзена на розных прадпрыёмствах 46 дакладаў на тэму аб дзіцячай бяспрытульнасьці. Усюды сходы выносілі пастановы аб калектыўным уступленьні ўсіх рабочых і служачых у т-ва «Прыхільнік дзяцей».

ВЫСТАЎКА ДЗІЦЯЧЫХ ВЫРАБАЎ.

Гэтымі днямі на Ленінскай вуліцы адчынілася выстаўка вырабаў дзяцей з дзіцячых дамоў. Тут сабраны экспанаты, пачынаючы ад дзяцей школьнага ўзросту і канчаючы прамысловымі таварамі розных прафэсыянальна-тэхнічных школ і майстэрняў. На выстаўцы ёсьць такія экспанаты (абутак, сталярныя вырабы і інш.), якія па сваёй якасьці на ўступаюць вырабам самых лепшых майстроў.

Некаторыя дзіцячыя калёніі прадставілі на выстаўку экспанаты сваіх гародаў. Выхаванец Барысаўскага піянэр-дому, 13-цігадовы хлапец, выставіў 2 партрэты — У. Леніна і М. Горкага, якія зварачаюць увагу мастацкім выкананьнем і сьведчаць аб пэўнай таленавітасьці хлапца.

ШВЭЙНЫ ГУРТОК: быўшыя бяспрытульныя за працай.

МАТАР'ЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА.

Менская акруговая камісія па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю выдала датацыю на палепшаньне ўтрыманьня выхаванцаў дзіцячых дамоў па лініі акрана—16500 руб. і «Охматкладу» — 9680 руб. Апроч гэтага, у працягу апошняга месяца выдана «Охматкладу» 4000 р. на ўтрыманьне ясьляў да канца бюджэтнага году.

З БЯСПРЫТУЛЬНЫХ ВЫХОЎВАЮЦЦА СУМЛЕННЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ.

Дзеля навучаньня бяспрытульных дзяцей пэўнай прафэсіі Менская акруговая камісія нядаўна заключыла дагавор з №-скім палком аб залічэньні бяспрытульных у музыканцкую каманду. Дзеці да таго часу будуць знаходзіцца пры камандзе, пакуль дасканаха ня вывучаць сваю прафэсію.

РЭЧАВАЯ ЛЁТАРЭЯ.

У пачатку кастрычніка ў Менску будзе арганізавана рэчавая лётарэя на карысьць бяспрытульных; усяго будзе распаўсюджана білетаў на 5000 р. Паміж рэчамі лётарэі ёсьць нікелевыя ложкі, кравецкія машыны, вэлёсыпэды і інш.

Што зроблена ў месячнік дапамогі бяспрытульным.

(*Аршаншчына*).

У сучасны момант на Аршаншчыне разгорнута кампанія дапамогі бяспрытульным. Кампанія працягнецца да 20 верасьня.

Зараз ужо маюцца станоўчыя вынікі праведзенай працы: з вуліцы ўзята на працягу часу з 26 жніўня і да 1 верасьня 176 чалавек бяспрытульнікаў, з іх 20-25 проц. дзяўчат. 38 чалавек перадана бацькам і сваякам; рэшта бяспрытульных зьмешчана ў Аршанскі дзіцячы прыёмнік.

На барацьбу з бяспрытульнасьцю дзяцей мяркуецца выдаткаваць 4-5 тысяч рублёў.

Пры Аршанскім дзіцячым прыёмніку дзіцячай камісіяй арганізаваны майстэрні шавецкая і загатовачная, у якіх навучаюцца рамяству 50 быўшых беспрытульных. У шавецкай вучаюцца хлопцы, а ў загатовачнай—дзяўчаты.

Зараз ужо маюцца некаторыя вучні, якія пачынаюць самастойна выконваць ня вельмі складаныя заданьні.

З агульнай колькасьці бяспрытульных уступіла ў шэрагі КСМ 14 чалавек і некалькі чалавек запісаліся ў піянэры. Для выхаваньня дзяцей падабраны адпаведны штат выхавальнікаў, настаўнікаў і інструктароў, а зараз прыцягнуты да гэтай працы актыўныя комсамольцы.

С-ў.

Прымаюцца патрэбныя меры.

З 1 верасьня да 1 кастрычніка ў акрузе праводзіцца месячнік па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю. На ўсіх прадпрыёмствах праводзяцца гутаркі аб барацьбе з бяспрытульнасьцю, у клюбах наладжваюцца спэцыяльныя вечоры, прысьвечаныя месячніку. У райёнах утвораны камісіі па барацьбе з бяспрытульнасьцю. Прэзыдыум акрвыканк. дазволіў праводзіць скарбоначны збор на карысьць бяспрытульных і даручыў таварыству пачаць працу па арганізацыі ячэек таварыства пры сельсаветах.

Гомель.

Раскладка на 8 месяцаў дае магчымасьць набыць 2-ю пазыку індустрыялізацыі кожнаму, хто мае нават самыя маленькія зьберажэньні.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ КАМУНА.

(*Па матар'ялах НК РСІ*).

Нядаўна НК РСІ правёў абсьледваньне Усебеларускай Дзіцячай Камуны дзеля азнаямленьня з жыцьцём і працай Камуны і высьвятленьня пытаньня, зьвязанага з газэтнымі заметкамі аб азначанай Камуне. («Чыр. Зьмена» № 88, «Рабочай» № 183 і г. д.).

Матар'ялы, дабытыя абсьледваньнем, у сваёй сукупнасьці даюць сапраўдны малюнак жыцьця і працы Камуны.

АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПЭРЫЯД НЯ СКОНЧАН.

Усебеларуская Камуна адчынена 9-XI—27 г. пры аб'яднаньні двух дзіцячых камун—імя Леніна і 1-га Мая, з агульнай колькасьцю 97 дзяцей.

У сучасны момант Камуна мае дзіцячы калектыў у 150 чал. Укамплектаваньне камуны дзецьмі праходзіла і праходзіць увесь час. Асноўны кадр—зусім бяспрытульныя дзеці. Дзеці прысылаліся округамі, „падбіраліся на вуліцы"; шмат дзяцей—пераросткі, слабы дысцыплінаваныя, ёсьць разумова адсталыя, хворыя і г. д. Так паступова складаўся дзіцячы калектыў, з якім у першы час было працаваць цяжка. Нягледзячы на недысцыплінаванасьць, а адтуль—непаслухмянасьць, сядзеньне ў пакоях у тужурках, у паліто і шапках, ляжаньне на ложках у брудным абутку, нядобрыя адносіны да маемасьці, кіданьне місак з харчамі, курэньне, лаянка, самавольныя адлучкі ў горад, на рынак, на станцыю і г. д.

Горкае жыцьцё, часта з самых малых гадоў, бяз ласкі азлобіла іх, налажыла свой адбітак на склад іх характару. Іх выхоўвала вуліца, рынкі, вакзалы...

ЦЯПЕР ІХ БАЦЬКІ—САВЕЦКІ ЎРАД І ПАРТЫЯ.

Дзякуючы таму, што выхавацелі ўжываюць да дзяцей ласкавы і прадуманы падыход, дзеці набываюць іншы выгляд: яны яскрава ўбачылі і адчулі вялікую розьніцу паміж вуліцай і арганізаваным калектывам.

Дастатковае абсталяваньне кухні-харэўні, інтэрнату, забясьпечаньне вопраткай; прыняцьце мерапрыёмстваў чыста выхаўчага зьместу, як арганізацыя школы пры камуне, пазашкольная праца, арганізаванае правядзеньне сьвяткаваньня рэвалюцыйных дзён—паскорылі складаньне здаровага дзіцячага калектыву. Характэрна ўжо тое, што „уцекачы" вярнуліся ў Камуну, вярнуліся да арганізацыйнага жыцьця.

Дзеці пачынаюць любіць школу, добра займаюцца, што і адзначана пры наведваньні школы акр. інсп. пры НК Асьветы.

ВОЛЬНЫ ЧАС ДЗЕЦІ ПРАВОДЗЯЦЬ РАЗУМНА.

Паступовая арганізацыя па-зашкольнай працы стварыла магчымасьць больш правільна арганізаваць іх вольны час, згодна ўзросту, а галоўнае—папаўняць іх веды, атрыманыя ў школе. Усё гэта зьвязвала дзяцей з сучаснасьцю. Арганізуецца самакіраваньне, паступова лік дзяцей у самакіраваньні ўзмацняецца. Пачынаюць працаваць гурткі: літаратурны, мастацкі, харавы, драматычны і г. д. Разгортвае працу ячэйка КСМ. Тут—піянэры, юнкоры... Ёсьць сувязь з Чырвонай арміяй.

Над Камунай шэфствуе артчасьць. Арганізуецца чытальня. Бібліятэка паступова папаўняецца. Выпісваюцца газэты; дзеці па ўсіх галінах жыцьця і працы Камуны прымаюць удзел пад кіраўніцтвам выхавацеляў. Праводзіцца кожнадзённая 15-ці хвіл. зарадка, ёсьць конкабежцы, любіцелі лыжнага спорту і г. д.

ВЯСНОЙ І ЛЕТАМ.

Вучоба ў школе закончылася—дзеці прымаюцца за гаспадарку. Бязумоўна, на працу выходзяць у адпаведнай вопратцы—босыя. З іх дапамогай, пад кіраўніцтвам адміністрацыі і агранома Камуны, з частковай дапамогай наёмнай сілы, 188 гэктараў зямлі ў сучасны момант маюць узорны выгляд. Красуецца хмелевая плянтацыя, гародні і садовы гадавальнікі і інш. Дзеці бачаць свае дасягненьні і клопаты іх бацькоў—партыі і ўраду. Дзеці малоцяць, недаюць сваіх «красуль», і якая з іх больш малочная. А колькі кароў? —Каровы—гэта ўсе нашы і іх 45,—адказвае, расчырванеўшыся, пастух, горда абвёўшы вачыма сваё стада.

УСЮДЫ КІПІЦЬ ПРАЦА.

Група дзяцей, на чале са старшым, пры непасрэдным удзеле яго ў працы, збіраюць стары гонт. Грузяць на воз... «Добрая будзе падтопка, а тут будзе чыста»... Дзеці вясёлыя! Адзін з іх залез на высокі стог саломы і задае храпака пасьля працы, яго грэе сонейка; дзяўчаткі ідуць з кошыкамі з працы і сьпяваюць. Заг. гасп. часткай клапаціцца бегае па панадворку Камуны і аддае распараджэньні; на вэлёсыпэдзе імчыць агранам—аб'язджае поле... Шуміць горн у кузьні; растуць будынкі для Камуны. Толькі сумна выглядае сад: у ім сёлета мала яблык.

У сучасны момант Камуна—«ня гнілое балота», а сапраўдная Камуна, дзе паступова разьвіваецца і паляпшаецца жыцьцё: тут выхоўваюцца будучыя будаўнікі сацыялістычнай грамады.

МОРА ДАСЯГНЕНЬНЯЎ, РЭЧКІ НЕДАХОПАЎ.

Заўсёды кажуць, што ў вялікай сям'і не без паразуменьняў. Так і ў маладой Камуне. Частка выхавацеляў не адпавядае свайму прызначэньню; таксама былі і ёсьць «дзеткі», над якімі прыдзецца пакласьці ня мала выхаўчай працы. Тут ня трэба было згушчаць фарбы, як гэта было ў заметцы ў газэце. У Камуне адшукваліся мэтады працы: як увязваць працоўныя працэсы з пэдагагічнымі ўлетку і ўзімку, аб ролі майстэрні ў выхаваньні і сельскай гаспадарцы. Так, напрыклад, інструктар па сьлясарнай кажа, што першае месца павінна займаць сьлясарная майстэрня, агранам кажа, што сельская гаспадарка і г. д. Тлумачыцца тым, што Акр. Інспэктарыят мала зьвярнута на гэта ўвагі.

Камуна ня мае статуту, няма ўдасканаленых інструкцый аб абавязках абслугоўваючага пэрсаналу Камуны; не працуе эканомкамісія; наогул, недастатковае кіраўніцтва выхаўчай працай; слабавата разгорнута праца сярод КСМ Камуны, што ў некаторай меры адбілася на самакіраваньні дзіцячага калектыву. Выпадкі спазьненьня на заняткі аднаго выхавацеля і інструктара (т. т. Еленскі і Куркін)—аднаму з іх зроблена заўвага заг. Камуны, што гэтак рабіць нельга, што з гэтага пачынаюцца непаразуменьні: заг. Камуны абвінавачваюць у тым, што ў яго „свае і чужыя", пачынаецца недагаворанасьць паміж асобнымі працаўнікамі.

КАМУНУ АБСЬЛЕДУЕ АКРУГОВАЯ КАМІСІЯ.

Гэта было месяцы 2 таму назад. Камісія прыступіла да працы са спазьненьнем на два тыдні; сваю працу не узгадніла з калектывам служачых Камуны; не правяла ніводнай вытворчай нарады, не правяла калектыўнай гутаркі з дзецьмі, а гутарыла толькі з імі паасобку. Пачынаюцца сапраўды «сумныя дні Камуны», асабліва калі начынаюць пісацца газэтныя заметкі, у той час, як праца камісіі на скончана, нэрвуюць выхавацеляў, нэрвуюць і дзяцей. Заг. Камунай і частка працаўнікоў, ня гледзячы на ўсе непаразуменьні, больш умацняюць працу, і Камуна працягвае свае жыцьцё і працу.

З ВЯЛІКАЙ ГАРЫ—МЫШ.

Пры дакладным высьвятленьні пытаньняў аб Усебеларускай Дзіцячай Камуне, зьмешчаных у газэтных заметках, выяўлена, што падзелу дзяцей на «селіванцаў» і «ярмакоўцаў» ня было. Гэта было даказана на агульнай вытворчай нарадзе калектыву служачых Камуны і выхавацамі.

Выхавацельніца Лернэр дапушчала прыёмы выхаваньня — хватаньне за руку дзяцей і інш., але гэта, як сыстэмы, ня было: гэта—выпадкі хворага чалавека. Выхавалець Савініч, пра якога ў заметцы сказана, што ён нічога ня робіць—ня верна.

Праўда дзеці ўцякалі з Камуны, але вярнуліся, а гэта тлумачыцца тым, што арганізаванае жыцьцё узяло вверх над вуліцай.

Прыведзеныя куплеты — гэта ня творчасьць дзяцей Усебеларускай Камуны. Паэтэса Маркава—так названа ў газэтнай заметцы—малады пісьменьнік, дзеці чытаюць яе вершы.

У адносінах працы гурткоў—таксама няверна: былі недахопы, але гурткі працавалі. Гэта па заметцы ў газ. «Зьвязда».

Па другой заметцы ў газ. «Рабочай» «Застоявшееся болото должно быть потревожено».

Шмат паўтарэньняў з артыкулу «Зьвязды», ніякага палажэньня аб наказаньнях дзяцей у Камуне не распрацоўвалася. Выпадкаў дзяржаньня дзяцей у халодных калідорах ня было.

Антысэмітызму ў Камуне няма, бо што дзеці «прыносілі з вуліцы», хутка выпрамлялася, прыклад з Стаценка няверны.

Ніякага скажэньня лініі бюро Акругкомам КП(б)Б ня было, бо апошні своечасова рэагаваў на ўсе пытаньні, зьвязаныя з Камунай, і паступаў так, як гэта патрабуе дзіцячая ўстанова.

Па заметцы ў газ. «Чырв. Зьмена»—тыя самыя пытаньні, але больш заблытаныя, замест «бачкоў» фігуруюць «бочкі», («бачкі»—гэта місачкі і бязумоўна пэдрада правільна абгаварыла пытаньне, а ў заметцы пытаньне аб «бочках»). Адказных працаўнікоў называюць «усявышнімі», якія прыкрываюць неадпаведных працаўнікоў Камуны, але гэта ня мае ніякай падставы, Акругкомам КП(б)Б пацьверджана, што заг. Камуны адпавядае прызначэньню.

ШТО ПАСТАНАВІЛА ЦКК РСІ.

Разам з адзначэньнем дасягненьняў у працы Камуны Калегія РСІ вынесла пастановы, якія ў асноўным зводзяцца да наступнага:

Прапанована Цэнтр. Дзіцячай Камісіі, супольна з НКА распрацаваць статут аб Камуне.

Пры наведваньні Камуны інспэктурай НКА, апошняя павінна ўвязваць сваю працу з калектывам служачых і праводзіць адпаведныя гуткаркі з дзецьмі Камуны.

Адзначана, што газэтны матар'ял тэндэнцыйны і ў большай сваёй частцы не адпавядае сапраўднасьці, што камісія, якая абсьледвала працу Камуны, правяла работу нездавальняюча.

У прыватнасьці адзначана, што паміж асноўнымі работнікамі ня было дагаворанасьці ў працы, меліся зьявішчы склокі, што ня было дастатковага кіраваньня з

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

аб зацьвярджаньні часовага палажэньня пра суды пры сельскіх саветах.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Зацьвердзіць часовае палажэньне пра суды пры сельскіх саветах.

2. Даручыць Акруговым Выканаўчым Камітэтам разам з падрыхтоўкай да перавыбараў саветаў весьці падрыхтоўку выбараў у суды пры сельскіх саветах з тым, каб адначасна з выбарамі сельскіх саветаў на тых-жа выбарчых сходах былі выбраны суды пры сельскіх саветах па аднаму ў кожным раёне.

3. Даручыць Народным Камісарыятам Юстыцыі і Земляробства мець стары нагляд за дзейнасьцю судоў пры сельскіх саветах і пасьля году іх існаваньня зрабіць у Савеце Народных Камісараў даклад аб іх дзейнасьці.

4. Даручыць Цэнтральнай Выбарчай Камісіі разам з кіраўніцтвам перавыбарамі саветаў кіраваць таксама выбарамі судоў пры сельскіх саветах.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

1 верасьня 1928 г.
г. Менск.

Часовае палажэньне

ПРА СУДЫ ПРЫ СЕЛЬСКІХ САВЕТАХ.

1. Суд пры сельскім савеце складаецца з Старшыні, яго Намесьніка і дванаццаці членаў. Старшыня і Намесьнік Старшыні Суду выбіраюцца пленумам сельскага савету з ліку яго членаў. Члены суду выбіраюцца на агульных выбарчых сходах з ліку грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі данага сельскага савету і маюць права выбіраць у саветы.

Увага: У тым выпадку, калі сельскі савет мае больш дванаццаці выбарчых вучастку, лік членаў суду павялічваецца да колькасьці выбарчых вучастку у даным савеце.

2. Выбары суда пры сельскім савеце могуць быць сэкасаваны сельскім саветам паводле скаргу грамадзян, або грамадзкіх арганізацый.

3. Суд пры сельскім савеце выбіраецца адначасна з сельскім саветам на такі самы тэрмін, на які выбіраецца сельскі савет.

4. Пасяджэньні суда пры сельскім савеце адбываюцца ў складзе старшыні і двух членаў. Члены суда ўдзельнічаюць у яго пасяджэньнях на чарзе, якая ўстанаўляецца прэзыдыумам сельскага савету.

5. Дні тыдню, у якія адбываюцца пасяджэньні суда пры сельскім савеце, устанаўляюцца прэзыдыумам сельскага савету.

6. Старшыня і члены суда пры сельскім савеце ня маюць права ўдзельнічаць у разглядзе справы, калі яны самі зацікаўлены ў справе (калі яны родныя, сваякі, прыяцелі старон, матар'яльна зацікаўлены). Аб сваёй зацікаўленасьці ў данай справе старшыня ці член суда павінны заявіць самі. Пра гэта могуць заявіць таксама стороны. Пытаньне аб тым, ці можа старшыня ці член суда, аб зацікаўленасьці якога ёсьць заява, удзельнічаць у разглядзе справы, вырашаецца судом.

Калі суд прызнае, што старшыня ці член суда ў разглядзе справы ўдзельнічаць ня можа, то замест зацікаўленага ў справе старшыні суда ў пасяджэньні ўдзельнічае іншы член сельскага савету, а замест данага члена суда—іншы член суда.

7. Арганізацыя тэхнічнага абслугоўваньня суда пры сельскім савеце ўскладаецца на сельскі савет. Суд пры сельскім савеце карыстаецца пячаткаю сельскага савету.

8. Суд пры сельскім савеце можа разглядаць:

а) грамадзянскія справы на суму да дваццаці рублёў, апроч категорый, паказаных у арт. 10;

б) спрэчкі аб захопах і патравах зямлі працоўнага карыстаньня, аб перакосах, пераворках і д. т. п.;

в) іскі членаў сялянскага двара аб іх маёмасьці на суму да дваццаці рублёў і аб утрыманьні састарэлых членаў двара;

г) справы па разьдзелах.

9. Суд разглядае справы, паказаныя ў арт. 8 гэтага Палажэньня ў тых выпадках, калі абедзьве стороны пражываюць у межах данага сельскага савету, бо калі ісьцец, які пражывае ў іншым савеце, зьвернецца па ўласнаму жаданьню не ў народны суд, альбо ў раённую зямельную камісію па належнасьці, а ў сельскі суд па месцу мяшканьня адказчыка.

10. Суд пры сельскім савеце ня мае права разглядаць іскаў, старанай у якіх зьяўляюцца дзяржаўныя ўстановы альбо прадпрыемствы, а таксама іскаў аб зарплаце і аб аліментах.

11. Калі суд пры сельскім савеце прызнае, што справа яму непадсудна, то ён накіроўвае яе ў той суд, якому яна падсудна, і паведамляе аб гэтым стороны.

12. Суд пры сельскім савеце пачынае разгляд справы на пісьмовай альбо вуснай заяве, а таксама па даручэньні сельскага савету.

Заявы падаюцца старшыні альбо аднаму з членаў суда пры сельскім савеце, прычым вусная заява зараз-жа запісваецца ў пратакол.

13. Справа павінна быць разгледжана не пазьней як праз 2 тыдні.

14. Ісьцец і адказчык могуць паслаць замест сябе ў суд аднаго з членаў сям'і альбо двара, прычым даверанасьць запісваецца на паветсцы альбо заяўляецца суду вусна.

Калі суд прызнае гэта за патрэбнае, то можа патрабаваць, каб адказчык зьявіўся сам.

15. Справа разглядаецца публічна і вусна.

Суд павінен заслухаць іска і адказчыка, абмеркаваць іх довады і стараца памірыць іх.

16. Пастанова суда прымаецца большасьцю галасоў. Ніхто з судзьдзяў ня можа адмовіцца падаць свой голас. Кожны судзьдзя можа заявіць асобны погляд, які не агалошваецца, але павінен быць запісан і далучан да справы.

17. Пастанова суда падпісваецца судзьдзямі і пасьля гэтага абвяшчаецца старанам.

18. Пастанова павінна вымяшчаць:

а) год, месяц і дзень, калі яна прынята;

б) імёны і прозьвішчы судзьдзяў;

в) імёны і прозьвішча ісца і адказчыка;

г) кароткі зьмест справы (замест пратаколу);

д) рашэньне суда;

е) парадак абскарджаньня.

Увага: Калі стороны памірыліся, то суд запісвае, на чым яны памірыліся. Гэты запіс мае сілу рашэньня.

19. Стороны могуць атрымліваць копіі пастановы суда бясплатна.

20. Судовыя зборы ў судзе пры сельскім савеце не бяруцца.

21. На пастанову суда пры сельскім савеце можа быць падана скарга не пазьней 2-х тыдняў з дню вырашэньня справы:

1) па справах, паказаных у п. „а" арт. 8, у народны суд, у раёне якога даны суд знаходзіцца, і 2) па справах, паказаных у п. п. «б», «в» і «г» арт. 8—у раённую зямельную камісію.

Пастановы суду пры сельскім савеце па справах аб патравах і перакосах зьяўляюцца канчатковымі, абскарджаньню не падлягаюць і зараз-жа выконваюцца.

22. Калі народны суд альбо ў адведных выпадках раённая зямельная камісія прызнаюць, што пастанова суда пры сельскім савеце парушае закон альбо відавочна парушае інтарэсы працоўных, то яны альбо пасылаюць справу на новы канчатковы разгляд таго самага суда ў іншым складзе, альбо вырашаюць яе самі, прычым у гэтым разе, калі налічаць гэта за патрэбнае, могуць выклікаць стороны і сьведак.

23. Пастановы суда пры сельскім савеце, апроч пастаноў па справах аб патравах і перакосах, падлягаюць выкананьню пасьля сканчэньня тэрміну на абскарджаньне, альбо калі скаргі на пастановы суда пры сельскім савеце будуць адхілены народным судом ці раённай зямельнай камісіяй.

Пастанова суда выконваецца па даручэньні старшыні сельскага савету праз апарат сельскага савету на падставе выданага судом выканальнага ліста.

24. Інструктаваньне і рэвізія суда пры сельскім савеце ўскладаюцца ў дачыненьні да справ, паказаных у п. «а» арт. 8, на адведны народны суд, а ў дачыненьні да справ, паказаных у п. п. «б», «в» і „г" арт. 8, на адведную раённую зямельную камісію.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

1 верасьня 1928 г.
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об утверждении временного положения о судах при сельских советах.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

1. Утвердить временное положение о судах при сельских советах.

2. Поручить Окружным Исполнительным Комитетам вместе с подготовкой к перевыборам советов вести подготовку выборов в суды при сельских советах с тем, чтобы одновременно с выборами сельских советов на тех же избирательных собраниях были избраны суды при сельских советах по одному в каждом районе.

3. Поручить Народным Комиссариатам Юстиции и Земледелия иметь постоянное наблюдение за деятельностью судов при сельских советах и по истечении года их существования сделать в Совете Народных Комиссаров доклад об их деятельности.

4. Поручить Центральной Избирательной Комиссии вместе с руководством перевыборами советов руководить также выборами судов при сельских советах.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

1 сентября 1928 г.
г. Минск.

Временное положение

О СУДАХ ПРИ СЕЛЬСКИХ СОВЕТАХ.

1. Суд при сельском совете образуется в составе Председателя, его Заместителя и двенадцати членов. Председатель и заместитель председателя суда избираются пленумом сельского совета из числа его членов. Члены суда избираются на общих избирательных собраниях из числа граждан, проживающих на территории данного сельского совета и имеющих право избирать в советы.

Примечание: В том случае, если сельский совет имеет больше двенадцати избирательных участков, число членов суда увеличивается до количества избирательных участков в данном совете.

2. Выборы суда при сельском совете могут быть отменены сельским советом на основании жалоб граждан или общественных организаций.

3. Суд при сельском совете избирается одновременно с сельским советом на такой же срок, на который избирается сельский совет.

4. Заседания суда при сельском совете происходят в составе председателя и двух членов. Члены Суда принимают участие в его заседаниях по очереди, устанавливаемой президиумом сельского совета.

5. Дни недели, в которые происходят заседания суда при сельском совете, устанавливаются президиумом сельского совета.

6. Председатель и члены суда при сельском совете не имеют права принимать участие в разборе дела, если они сами заинтересованы в деле (если они родственники, свояки, приятели сторон, материально заинтересованы). О своей заинтересованности в данном деле председатель или члены суда должны заявить сами. Об этом могут заявить также стороны. Вопрос о том, может ли председатель или член суда, о заинтересованности которого имеется заявление, принимать участие в разборе дела, разрешается судом.

Если суд признает, что председатель или член суда в разборе дела принимать участия не может, то вместо заинтересованного в деле председателя суда в заседании принимает участие другой член сельского совета, а вместо данного члена суда—другой член суда.

7. Организация технического обслуживания суда при сельском совете возлагается на сельский совет. Суд при сельском совете пользуется печатью сельского совета.

8. Суд при сельском совете может рассматривать:

а) гражданские дела на сумму до двадцати рублей, кроме категорий дел, указанных в ст. 10;

б) споры о захватах и потравах земли трудового пользования, о перекосах, перепашках и т. д.;

в) иски членов крестьянского двора об их имуществе на сумму до двадцати рублей и о содержании престарелых членов двора;

г) дела о разделах.

9. Суд рассматривает дела, указанные в ст. 8 настоящего Положения, в тех случаях, если обе стороны проживают на территории данного сельского совета, или если истец, проживающий в другом совете, обратится по собственному желанию не в народный суд или в районную земельную комиссию по принадлежности, а в сельский суд по месту жительства ответчика.

10. Суд при сельском совете не имеет права разбирать иски, стороной в которых являются государственные учреждения или предприятия, а также иски о зарплате и алиментах.

11. Если суд при сельском совете признает, что дело ему неподсудно, то он направляет его в тот суд, которому оно подсудно, и сообщает об этом сторонам.

12. Суд при сельском совете приступает к разбору дела по письменному или устному заявлению, а также по поручению сельского совета.

Заявления подаются председателю или одному из членов суда при сельском совете, причем устное заявление тотчас же записывается в протокол.

13. Дело должно быть рассмотрено не позже, чем через две недели.

14. Истец и ответчик могут послать вместо себя в суд одного из членов семьи или двора, причем доверенность записывается на повестке или заявляется суду устно.

Если суд признает необходимым, то может требовать, чтобы ответчик явился сам.

15. Дело разбирается публично и устно. Суд должен выслушать истца и ответчика, обсудить их доводы и стараться помирить их.

16. Решение суда принимается большинством голосов. Никто из судей не может отказаться подать свой голос. Каждый судья может заявить свое особое мнение, которое не оглашается, но должно быть записано и приложено к делу.

17. Решение суда подписывается судьями и после этого оглашается сторонам.

18. Решение должно содержать:

а) год, месяц и день, когда оно принято;

б) имена и фамилии судей;

в) имена и фамилии истца и ответчика;

г) краткое содержание дела (вместо протокола);

д) решение суда;

е) порядок обжалования.

Примечание. Если стороны помирились, то суд записывает, на чем они помирились. Эта запись имеет силу решения.

19. Стороны могут получать копии решения суда бесплатно.

20. Судебные сборы в суде при сельском совете не взимаются.

21. На решение суда при сельском совете может быть подана жалоба не позже 2-х недель со дня разрешения дела:

1) по делам, указанным в п. «а» ст. 8 в народный Суд, в районе которого данный суд находится, и 2) по делам, указанным в п. п. «б», «в» и «г» ст. 8—в районную земельную комиссию.

Решение суда при сельском совете по делам о потравах и перакосах являются окончательными, обжалованию не подлежат и немедленно исполняются.

22. Если народный суд или в соответствующих случаях районная земельная комиссия признают, что решение суда при сельском совете нарушает закон или явно нарушает интересы трудящихся, то они или посылают дело на новое окончательное рассмотрение того же самого суда в другом составе, или разрешают его сами, причем в этом случае, если сочтут нужным, могут вызвать стороны и свидетелей.

23. Решения суда при сельском совете, кроме решений по делам о потравах и перекосах, подлежат исполнению после окончания срока для обжалования, или если жалобы на решения суда при сельском совете будут отклонены народным судом или районной земельной комиссией.

Решение суда исполняется по поручению председателя сельского совета аппаратом сельского совета на основании выданного судом исполнительного листа.

24. Инструктирование и ревизия суда при сельском совете возлагается в отношении дел, предусмотренных п. „а" ст. 8, на соответствующий народный суд, в отношении дел, указанных в п. п. «б», «в» и «г» ст. 8,—на соответствующую районную земельную комиссию.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

1-го сентября 1928 г.
г. Минск.

ПАПРАУКА.

У артыкуле 2 пастановы ЦВК і СНК БССР ад 1 верасьня 1928 г. аб назначэньні тав. СТАШЭЎСКАГА А. Я. Народным Камісарам Юстыцыі БССР, якое апублікавана ў газэце «Савецкая Беларусь» ад 11 верасьня 1928 г., № 209, пасьля слоў: „Назначыць т. СТАШЭЎСКАГА А. Я. Народным Камісарам Юстыцыі БССР" дадаць выпадкова апушчаныя словы «і ПРАКУРОРАМ РЭСПУБЛІКІ".

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

13 верасьня 1928 г., г. Менск.

ХРОНІКА.

У „Маладняку".

Пленум ЦБ „Маладняка".

23 верасьня адбудзецца чарговы пленум ЦБ «Маладняка» з наступным парадкам дня: аб зьезьдзе БелАПП'у, праверка складу «Маладняка», аб сьвяткаваньні пяцігодзьдзя „Маладняка".

Аб удзеле ў сьвяткаваньні 10 угодак БССР.

На апошнім пасяджэньні ЦБ „Маладняка" па пытаньні аб удзеле ў сьвяткаваньні 10-годзьдзя БССР, ухвалена зьвярнуць увагу ўсіх сяброў «Маладняка» на неабходнасьць адбіць у сваёй творчасьці гэраічны шлях БССР за 10 гадоў.

Склад сяброў Менскай філіі «Маладняка».

Бюро Менскай філіі „Маладняка" падвяло вынікі аб складзе сяброў Менскай філіі «Маладняка» ў лічбах. Усяго ў Менскай філіі лічыцца 38 сяброў.

Па сацыяльнаму складу з рабочых—4, сялян—28, служачых—3, іншых—3.

Па нацыянальнасьці: беларусаў—36, яўрэяў—2.

Па партыйнай прыналежнасьці: сяброў і кандыдатаў КП(б)Б—6, камсамольцаў—13, беспартыйных—19.

Па адукацыі: з вышэйшай—3, студэнтаў—28, з сярэдняй—7.

Па творчасьці: паэтаў—21, празаікаў—12, крытыкаў—4, пераважна ў чужаземных моў—1. З іх маюць зборнікі—19, з прынятымі ў БДВ зборнікамі да друку—3, ня маюць зборнікаў—16.

Па маладнякоўскаму стажу: з 1925 г.—12, з 1926 г.—16, з 1928 г.—10.

Культурна-масавая праца Менскай філіі.

На працягу сакавіка—жніўня месяцаў Менскай філіяй «Маладняка» праведзена было 15 літаратурных вечароў.

Вечары ў пераважнасьці праводзіліся ў рабочых клюбах.

Абслужана звыш 4000 слухачоў.

Менскі дзень.

— Усебеларускі зьезд будаўнікоў назначана склікаць у Менску на 5 кастрычніка. У працах зьезду прымуць удзел 125 дэлегатаў.

— Намесьнікам загадчыка Белдзяржкіно па літаратурна-мастацкай справе прызначаў Нар. Кам. Асьветы БССР т. Дыла Язэпа Лявонавіча.

Вечар, прысьвечаны юбілею Талстога.

Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту наладжвае ў панядзелак, 17 верасьня, у актавай залі БДУ вечар, прысьвечаны 100 годзьдзю з дня нараджэньня Л. М. Талстога. З дакладамі аб творчасьці Талстога выступяць прафэсары БДУ Замоцін, Вальфсон, Вазьнясенскі і Васілейскі.

Падрыхтоўка да юбілею Ц. Гартнага.

Інбелкульт вядзе падрыхтоўку да сьвяткаваньня 20-гадовага юбілею літаратурнай дзейнасьці вядомага беларускага пралетарскага пісьменьніка Цішкі Гартнага (Жылуновіча). Да юбілею будзе выдана кніга—«Цішка Гартны ў літаратурнай крытыцы».

Дапамога палітвязьням.

ЦК Мопр'у БССР падвёў вынікі кампаніі зімовай дапамогі палітвязьням. Усяго па гэтай кампаніі было сабрана 34.300 р. Акрамя гэтага, сярод працоўных БССР было сабрана ў карысьць Беларускай Грамады 18.454 руб.

Выплата выйгрышаў.

Беларускае аддзяленьне Дзяржбанку выплаціла з 1-га да 13-га верасьня па 4-м тыражы 1-й пазыкі індустрыялізацыі 6.692 руб. і па пазыцы 1924 г. 2 выйгрышы па 50 руб. Апрача гэтага, Дзяржбанкам выплачана па 8-м тыражы пазыкі 1926 г. за гэты-ж час 3.950 руб., з якіх 2 выйгрышы па 250 руб.

Падрыхтоўка працаўнікоў „Аўтадору" для вёскі.

Гэтымі днямі адбыўся выпуск курсаў „Аўтадору", арганізаваных для адпусквікоў-чырвонаармейцаў. Усяго скончылі курсы 46 чал. Скончыўшыя будуць выкарыстаны для працы на „Аўтадору" на вёсцы.

Аб забесьпячэньні старых сялян.

У выкананьне пастановы юбілейнай сэсіі ЦВК СССР і БССР, Нар. Кам. Сацыяльнай Забясьпечы БССР распрацаваў праэкт пастановы ЦВК і СНК БССР аб забясьпечаньні малаімоцных старых сялян. Па гэтаму праэкту прадугледжваецца з новага бюджэтнага году выдаваць старым сялянам пэнсію ў разьмеры 50 руб. У першую чаргу сёлета будуць забясьпечвацца малаімоцныя сяляне з 70 гадовага ўзросту і вышэй. Зараз гэты праэкт перададзен на пераапрацоўку ў камісію законадаўчых праэктаў СНК БССР.

Вынікі градабіцьця па БССР.

Па даных Белдзяржстраху, ад градабіцьця, якія адбыліся ў працягу лета, на тэрыторыі БССР былі пашкоджаны пасевы на плошчы 36.500 дзесяцін. Найбольш напярпелі ад градабіцьця Магілеўская (14.600 дзес.), Аршанская (5.840 дзес.) і Менская (5.950 дзес.) акругі. Менш усяго пацярпелі Мазырская і Полацкая акругі (усяго 535 дзес.).

Белдзяржстрахам выплачана пацярпеўшым гаспадаркам страхавой узнагароды ў суме 217.850 руб.

Арганізацыя страхавога музэю.

Белдзяржстрах вядзе падрыхтоўку да арганізацыі ў новым Доме Селяніна страхавога музэю. Для арганізацыі гэтага музэю будзе адведзены спэцыяльны пакой.

У музэі будуць выстаўлены экспанаты, якія характарызуюць старую нежаўнаўраздаваную вёску і новую. Таксама там будуць выстаўлены дыяграмы, якія характарызуюць рост страхаваньня жывёлы, сельска-гаспадарчых культур і інш. за 7 гадоў. На арганізацыю музэю Белдзяржстрах адпусціў 3000 р.

Захаваньне сярэдняга заработку за дэлегатамі партканфэрэнцый.

Нар. Кам. Працы БССР распрацаваў, што за рабочымі і служачымі, якія выбіраюцца ў якасьці дэлегатаў для ўдзелу ў партыйных і камсамольскіх зьездах, канфэрэнцыях і пленумах ня ніжэй акруговага маштабу, захоўваецца сярэдні заработак на ўвесь час працы гэтых зьездаў, канфэрэнцый і пленумаў.

Падрыхтоўка да аб'яднаньня вакзалаў МББ і Заходніх чыгунак.

У сувязі з аб'яднаньнем вакзалаў МББ і Заходніх чыгунак і пераносам усіх пасажырскіх апэрацый на Заходні вакзал, у сучасны момант на Заходнім вакзале праводзіцца рамонт платформ і замацаваньне іх асфальтам. Апрача гэтага, заканчваецца пабудова веткі, якая злучыць МББ з Заходнімі чыгункамі.

Судовая хроніка.

Да справы Сукеніка.

Як вядома, 23-га ліпеня Менскі акруговы Суд разглядзеў справу па абвінавачваньні Сукеніка Якуба ў злоўжываньні і прывышэньні ўлады на службе і прыгаварыў яго да пазбаўленьня волі з суровым абмежаваньнем на 5 год і з пераважэньнем у правох тэрмінам на 2 гады.

8-га верасьня Вярхоўны Суд разглядзеў гэтую справу па касацыйнай скарзе Сукеніка і знайшоў, што судовае сьледзтва па справе праведзена дастаткова і прыгавар адвядае маючымся ў справе доказам, чаму і касацыйная скарга асуджанага ўвагі не заслугоўвае.

Пры разглядзе справы ў рэвізійным парадку Вярхоўны Суд таксама не знайшоў парушэньняў закону, якія маглі-б служыць падставай для адмены прыгавару, а таму прыгавар пакінуў у сіле, а касацыйную скаргу асуджанага бяз вынікаў.

Прыняўшы пад увагу, што ўчыненыя асуджаным Сукенікам дзеньні ня мелі карыснага характару, яго першую судзімасьць, ранейшую працу і хворае становішча, Вярхоўны Суд зьняў з асуджанага Сукеніка суровае адмежаваньне і пазбаўленьне ў правох.

15-га верасьня а 4 гадзіне у клюбе КІМ адчыняецца ЧАРГОВЫ ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ.

ПАВЕСТКА ДНЮ:

1. Аб разгортваньні самакрытыкі, унутры-саюзнай дэмакратыі і высоўваньні актыву ў ЛКСМБ.
2. Аб становішчы гаспадарчай працы ў вёсцы.
3. 5-цігадовы плян народнае гаспадаркі і падрыхтоўка кваліфікаванай рабочай сілы.
4. Аб палітвучобе на 28-29 год.

На пленум запрашаюцца сябры Бюро Мен. АК ЛКСМБ, рэдактары юнацкіх газэт і прадстаўнікі ЦК у ЦП Прафсаюзаў.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ ГАЛАВАЧ.

ТЭАТР І МУЗЫКА.

Беларуская Дзяржаўная Капэля.

Беларускую Дзяржаўную Капэлю пад кіраўніцтвам т. Ягорава сёлета мяркуецца перавесьці на дзяржаўнае ўтрыманьне. Зараз у капэлі працуе 45 асоб. За апошнія 2 гады капэля значна вырасла, на гледзячы на тое, што яна працавала без матар'яльнае дапамогі.

Ёсьць думка прымацаваць капэлю да опэрнай клясы Белмузтэхнікуму, дзе яе можна будзе выкарыстаць пры опэрных пастаноўках. З тае прычыны, што пры Белмузтэхнікуме ёсьць вячэрняя харавая кляса, прадугледжваецца злучыць з Капэлаю лепшую частку гэтае клясы.

У мінулым сэзоне з Капэляю выключна працаваў адзін т. Ягораў, зараз з ёй пачынае працаваць т. Сэлях, які будзе кіраваць вакальнай часткай і мастацкай апрацоўкай рэчаў.

На жаль, адчуваецца вялікі брак у музычных творах. Наркамасьветы павінен зьвярнуць увагу на выданьне адпаведных музычных твораў. У ІБК ёсьць толькі неапрацаваны музычны матар'ял, які не гадзіцца для выкарыстаньня яго.

Гарманізацыя беларускай песьні.

Да гэтага часу ў нас мала што зроблена ў галіне гарманізацыі беларускай песьні. З гэтага году пры Белмузтэхнікуме будзе стала пастаўлена гэта справа, кіраўніцтва гэтай справай будзе даручана новаму выкладчыку тэорыі кампазыцыі, якім мяркуецца быць праф. Ленінградзкай кансэрваторыі Чарноў.

Запрашэньне дырыжэра ў Музтэхнікум.

Вядуцца перагаворы аб запрашэньні дырыжэра для опэрнай клясы Белмузтэхнікуму з дырыжэрам б. Марыінскага тэатру ў Ленінградзе т. Пахітанавым і дырыжэрам Харкаўскага тэатру—т. Міхайлавым.

Опэрныя пастаноўкі Белмузтэхнікуму.

Працу над опэрнымі пастаноўкамі Белмузтэхнікум увязвае з БДТ1, які будзе дапамагаць тэхнічнай справай, дэкарацыямі і інш. У наступным сэзоне маюць пайсьці наступныя опэры: „Совільскі цырульнік", „Русалка", «Галька» і старая пастаноўка «Фаўст».

З 1929-30 г. у Белмузтэхнікуме прадугледжваецца арганізацыя опэрнай студыі.

Арганізацыя драматычнай студыі.

Драматычная кляса Белмузтэхнікуму перадаецца БДТ1, якая стане сталай драматычнай студыяй, накшталт маскоўскай студыі, з якой стварыўся БДТ2. У студыю будуць запрошаны адпаведныя выкладчыкі і рэжысэрскі склад БДТ1.

Студыя разьлічана на 35 асоб. Частка з іх будзе атрымоўваць стыпэндыі.

Запрашэньне новага балетмэйстра.

БДТ1 запрасіў на сталую працу ў трупу тэатру балетмэйстра Сямёнава і салістку балету Бреві, якія ўжо прыехалі ў Менск.

т. Сямёнаў зараз працуе над інтэрмэдыямі да п'есы «Мешчанін у шляхцьце», якая была адноўлена ў мінулым сэзоне.

Калі будзе пастаўлена „На купальле".

М. Чарот зараз канчае перапрацоўваць лібрэта музычнай драмы «На купальле», пасьля чаго кампазытар Аладаў будзе пісаць новую і перапрацоўваць старую музыку з захаваньнем мэлёдыі.

«На купальле» будзе пастаўлена ў адзнаку дзесятых угодак існаваньня БДТ1, як савецкага беларускага тэатру

Паштовая скрынка.

Міхальцову.—Ня пойдзе.

М. Вярбе. Ваш допіс перасылаем у ЦБ «Маладняка».

Лявону Чыжу. У вашым апавяданьні «Мар'я» адсутнічае сюжэтная сувязь; усе падзеі вынікаюць самі па сабе і не абумоўлены папярэднімі. Трэба больш працаваць над сваімі творамі.

А. Беднаму, Крыніцы, Абложыну, Рамаучуку, А. Струку, Вішнякову, Вядзіму Яснаму, Р. Кучынскаму, Сяргею Вяшчуну, і Сарнажнаму.—Верш вашы ня пойдуць. Трэба больш вывучаць тэхніку пісаньня вершаў, больш чытаць і больш апрацоўваць вершы.

Я. Іалобаву.—Перш усяго вам трэба добра вывучыць беларускую мову. А наогул у вашых вершах значна культае рыфм і, самае галоўнае, вобразы і вобразная кампазыцыя пакідаюць жадаць лепшага.

Білоўсенаму. У вашых вершах спатыкаюцца пасобныя добрыя мясьціны, але пакуль што іх яшчэ вельмі мала. Працуйце далей і старайцеся больш заўладаць тэхнікаю мастацкай творчасьці. Старайцеся унікаць адцягнёных тэм і бярэце больш канкрэтны матар'ял.

„Пацярпеўшаму". Аб недарэчнасьцях у ЦП саюзу прац. зямлі і лесу накіравана ў РСІ.

Ясенку І. І. Вельмі добра, што вы ўзялі жывую, цікавую і востую тэму для верша. Але тэмы гэтай вы ня здолелі апрацаваць; да таго-ж у вас ня вельмі добра стаіць справа і з мовай. Верш ня пойдзе.

Гр-ну Іоўрыну Барысу. Плошча, занятая двароч і будынкамі, пад насенным лубінам і насенняй канюшынай не абкладаецца падаткам.

У мясцовасьцях, дзе паляводства абкладзена на пасевах, плошчы, якія заняты зялёным угнаеньнем—лубінам, таксама не абкладаюцца падаткам.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газ. «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кніжкі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. „На зломе" Я. Нёманскі. Апавяданьні. Выданьне другое. Стар. 355, цана 1 руб. 55 кап.

2. „Сваякоі тэатр". Алесь Ляжневіч. Дарады ў пытаньнях тэатральнай тэхнікі і мэтады пастаноўкі п'ес сялянскіх і гарадзкіх клюбных драмгурткамі. Стар. 174, цана 1 руб.

3. «Яўрэйская літаратура ў пытаньнях, заданьнях і тэмах». Г. Яброў. Стар. 44, цана 40 кап. На яўрэйскай мове.

4. „Плуг" № 7-8. Стар. 79, цана 60 к. Дзяржаўнага Выдавецтва Украіны.

5. «Плановае хозяйство» № 7. Стар. 349, цана 2 руб. Выданьне Дзяржплану СССР. Масква.

Апавяшчэньні

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 14 верасьня, кіно «ИНЖЕНЕР ЕЛАГИН». Пачатак а 8 і 10 гадз. Карціну суправаджае музычны дуэт.

Білеты—10 і 15 кап.

— У нядзелю, 15 верасьня, у Доме Асьветы адбудзецца агульны сход тэхнічных працаўнікоў і жонак рабочых саюзу працасьветы. Пачатак а 6 гадз. увечары.

1. Даклад аб займе індустрыялізацыі.
2. Справаздача дэлегатак.
3. Выбары на канфэрэнцыю.

Часова вык. абав. адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

ЦЫРК-КІНО.

ЦЫРК Сёньня ЦЫРК

І кожны дзень матчавая барба.

БОРУЦЦА ТРЫ ПАРЫ

мацнейшых спартсмэнаў-барцоў, а таксама вялікая цыркавая праграма. Першая гастроль М-тле ДАНКОВАЙ з групаю дрэсыраваных сабак.

Буфанадныя клёўны ЖАК І ЖАКОНІ

і шмат іншых нумароў.

Пачатак а 8 з палов. гадз Барба з 10 з пал. гадз.

Каса адчынена ад 11 да 3 гадзіны дню і ад 5 да 9 гадзіны ўвечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».

Ад аўторка, 11 верасьня мастацкі фільм паводле раману О'Нэйля

„ЖАНЧЫНА З КІРМАШУ" (Каханьне пад вязамі).

У галоўных ролях Бэла Білецкая і М. Шырот.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".

Ад аўторка 11 верасьня, ЮБІЛЕЙНЫ ФІЛЬМ да 100 х угодкаў нараджэньня Льва Мікалаевіча Талстога

аповесьць „КАЗАКІ" пастаноўка рэжысэра В. Г. Барскага.

СЭАНСЫ—пачатак 1-га а 7 гадз. 30 хв., 2 — а 9 гадз., 3—а 10 гадз. 30 х. Каса адчынена ад 6 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».

Ад аўторка, 11 верасьня нямецкі баявік

НЕБЯСЬПЕЧНЫ ЎЗРОСТ у 8 частках.

У галоўных ролях сусьветныя артысты: Бернард Гецке (вядомы па фільмах «Нялюдская гробніца», „Женщина с миллиардами", «Доктор Мабузо», «Пасынки Берлина». Аста Нільсен («Безрадостная улица»).

Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 хв. Каса адчынена ад 6 г.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».

З аўторка, 11 верасьня

„ПАТ І ПАТАШОН".

ЗАГС Слуцкага Гарсавету, Бабруйскае акругі, выклікае на 11 кастрычніка г. г. а 12 гадз. дню гр-на Шульца Іваны Восіпавага, які знаходзіцца невядома дзе, па справе аб скасаваньні шлюбу з яго жонкай Параскай Андрэеўай Шульц.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Пасьведчаньне за № 312 Роўда А. С., выд. Горацкай с.-гасп. акадэміяй, кв. 1215.

— Квіт. № 9 Зевеніч Е. М., выд Камісійным магаз. «Белнаркомпрадзіка», кв. 1216.

— Конская картка Рясюк Б., кв. 1163.

— Асабовая кніжка № 52-45 Даўгалова І., выд. Хвалынскім РВК, кв. 1164.

ВНИМАНІЕ! КАЖДЫЙ, КТО ПОДПИШЕТСЯ НА 4 МЕСЯЦА СЕНТЯБРЬ-ДЕКАБРЬ НА ГАЗЕТУ „ДЕР ЭМЕС", ЗА 85 К.

единственную театр. коммунистическую газету на еврейском языке, будет иметь право участвовать в БОЛЬШОЙ ЛОТЕРЕЕ, устраиваемой газетой «ДЕР ЭМЕС».

Будут разыграны 500 выигрышей, среди которых имеются очень ценные предметы.

СПЕШИТЕ ПОДПИСАТЬСЯ, ЧТОБЫ УЧАСТВОВАТЬ В ЛОТЕРЕЕ.

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: во всех Отд. Изд-в „Правда", «Известия» и т. д., во всех Отд. «Контрагента Печати», у всех контрагентов и агентов «ЭМЕС»а и во всех почтово-телеграфных к-рах.

Адрес главной конторы: Москва, Старопанский пер., дом 1.

Гр-н Моісіх Рува Ізраілеў, які паходзіць з грамадзян горада Бабруйску і жыве ў м. Клічаве, Бабр. акругі, вымяняе сваё імя і прозьвішча Рува Моісіх на імя Ісаак Станіслаўскі; асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены імя і прозьвішча, просяць паведаміць аб гэтым Гэбруйскі Акруговы ЗАГС, паказаўшы сваё імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жыцьця.

Духнава Куліна выклікае на 15-IX у Загранкі мужа свайго Духнава Антона па справе скасаваньня шлюбу.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту

**ад 4 верасьня 1928 г.